ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 81 (4333)
НЯДЗЕЛЯ, 10 красавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Множыць рады ўдарнікаў якасьці. А. ШАЎРОЎ — Да канца вытруціць «нэпманскі дух» (2 стар.). А. БРАЎДЭ — Машынабудаўніцтва ў 1932 г. (3 стар.).

БССР выканала заданьне па ссыпцы насеньня толькі на 73,2 проц. Правільнай расстаноўкай рабочай сілы — забясьпечым посьпехі сяўбы (1 стар.)

Уключым у работу па праверцы і ўмацаваньні бюро скаргаў шырокія працоўныя масы (2 стар.). Пашырэньнем пасеваў кармовых тэхкультур, умацаваньнем калгасных фарм адказваюць калгасьнікі на пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б (2 стар.). Ліквідаваць непрадуцыйныя прастоі (2-я стар.).

Віцебскія швэйная і абутковая фабрыкі яшчэ слаба змагаюцца за якасьць работы (3 стар.).

Паравозным брыгадам, рабочым чыгункі—добраякасны абед (3 стар.).

ПАСТАНОВУ САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б — ператварыць красавік у месяц штурму па ліквідацыі няпісьменнасьці (4 стар.).

ПОЛЬШЧА: Штыхамі і прыкладамі польскі фашызм душыць забастоўку ў Петракове (1 стар.).

КІТАЙ: Акупанты замацоўваюцца ў Шанхаі (4 стар.).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

МНОЖЫЦЬ РАДЫ ЎДАРНІКАЎ ЯКАСЬЦІ!

Праблема якасьці складае адну з апошніх, вузлавых задач для ўсіх вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. З вырашэньнем яе непарыўна зьвязана рэалізацыя ўсяго народнагаспадарчага пляну заключнага году першай пяцігодкі. Зусім зразумела, што кожны лішні процант зьніжэньня сабекошту, кожны зрух ва ўзьвышэньні прадукцыйнасьці працы, кожны крок, проблены ў галіне паляпшэньня якасьці прадукцыі, скарачэньня браку— усё гэта стварае новыя і новыя дадатковыя рэсурсы для ўсё большага і большага развароту нашых вытворчых працэсаў, для паскарэньня тэмпаў усяго гаспадарчага разьвіцьця краіны, для далейшага паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочай клясы і працоўных мас.

У пастановах XIV зьезду КП(б)Б мы знаходзім катэгарычнае ўказаньне аб тым, што **«выкананьне задач чацьвертага заваяваньнага году пяцігодкі высоўвае якасьць і якасныя паказальнікі, як цэнтральную баявую задачу ўсіх гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый».**

Гэта пастанова мае выключна глыбокі сэнс і значэньне іменна для беларускай прамысловасьці. Іменна па лініі якасьці ёсьць найбольшае адставаньне нашых прадпрыемстваў ад пляновых заданьняў. У 1931 г. якасныя паказальнікі засталіся невыкананымі. Няма неабходнага паляпшэньня і ў першым квартале бягучага году. Напрыклад, у галіне зьніжэньня сабекошту заданьні ня толькі ня рэалізуюцца, але студзень месяц па прамысловасьці, якая плянавалася ВСНГБ, паказвае павышэньне сабекошту на 2,1 проц., люты — на 3,2 проц. Ня ліквідаваны разрыў паміж ростам зарплаты і прадукцыйнасьці працы. Якасьць прадукцыі застаецца яшчэ далёка не на належным узроўні.

Гэта становішча абавязвае партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі літаральна прыкаваць сваю ўвагу да пытаньняў барацьбы за высокія якасныя паказальнікі работы, прыняць самыя неадкладныя і рашучыя меры да ліквідацыі адставаньня прамысловасьці на вучастку якасьці. Інакш мы можам паўстаць перад фактам саміх сур'ёзных затрудненьняў у барацьбе за плян бягучага году. Кароны пералом на вучастку якасьці павінен быць забяспечан у самы-ж бліжэйшы адрэзак часу.

Зараз у БССР праходзіць паласа галіновых канфэрэнцый ударнікаў якасьці. Учора адкрылася канфэрэнцыя швэйнікаў, абутнікаў і работнікаў прылаўка. 20 красавіка адбудзецца падобная-ж канфэрэнцыя па харчовай прамысловасьці.

Канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці заклікаюць адыграць вялізарную ролю ў справе мабілізацыі грамадзкай думкі вакол пытаньняў паляпшэньня якасьці работы прамысловасьці, у справе намячэньня канкрэтных мэрапрыемстваў, якіп-б забясьпечылі неабходныя зрухі ў гэтых адносінах.

Канфэрэнцыі павінны прайсьці **пад знакам барацьбы з тэй апартуністычнай недаацэнкай праблемы якасьці,** якая яшчэ мае сваё месца сярод некаторай часткі работнікаў прамысловасьці, у асобных зьвеньнях гаспадарчага апарату.

Трэба абвясьціць вайну ўсякім спробам пагоні **выключна** за колькасьцю ня зьвязаючы **высокіх колькасных паказальнікаў са штодзённай упартай работай над пытаньнямі якасьці прадукцыі,** ліквідацыі браку, барацьбы за зьніжэньне сабекошту, за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы. Трэба цьвёрда сказаць, што выкананьне колькасных паказальнікаў за лік якасных азначае фактычны зрыў прамфінпляну, і ня можа інакш разглядацца, як апортуністычнае партыі і рабочай клясы, як яўнае **«очковтирательство».**

Ня менш небясьпечна і шкодна і апартуністычнае працінстаўленьне ад варотнага пярэдку, імкненьне **«апраўдаць»** недавыкананьне колькасных заданьняў барацьбой за якасьць прадукцыі. На гэты шлях, напрыклад, стала Белшвэйаб'яднаньне, якое **«тлумачыла»** прарывы ў студзені і лютым месяцох тым, што, моў, **«узмоцнена занялося»** паляпшэньнем якасьці прадукцыі.

Барацьба за якасьць павінна ісьці ў нагу з усёй перабудовай работы прамысловасьці, на аснове 6 умоў тав. Сталіна, на аснове паляпшэньня ўсяго вытворчага працэсу.

Нельга змагацца за высокую якасьць прадукцыі без **ліквідацыі абязьлічкі ў абсталяваньні,** без **персанальнай адказнасьці кожнага рабочага** за выпушчаную ім прадукцыю, без дакладнага **ўліку вінаватых у браку,** бяз строгага **кантролю** над якасьцю прадукцыі на шляху ўсяго сьледваньня прадукцыі, пачынаючы з загатоўкі сыраў і канчаючы **спажыўцом.** Таварапрыемная сетка, снабжаючыя арганізацыі павінны адыграць для спажыўца сапраўдную ролю заслоны ад недобраякаснай прадукцыі.

Ураўнілаўка ў зарплаце — вораг высокай якасьці. Сыстэма зарплаты павінна быць пастаўлена на службу ўзьвышэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту, ліквідацыі браку. Перабудову зарплаты трэба зрабіць магутным вагаром у барацьбе за якасьць.

Выкананьне якасных паказальнікаў непарыўна зьвязана з **паляпшэньнем тэхнічнага кіраўніцтва прамысловасьцю, з выхаваньнем камандных кадраў, з падрыхтоўкай кваліфікаванай рабочай сілы.** Пытаньні **тэхнічнай прапаганды, рацыяналізатарскі рух, рабочае вынаходзтва** — усе гэтыя вучасткі работы трэба рашуча палепшыць, накіроўваючы ў рэчышча дзейснай барацьбы за прамфінплян.

Важнейшае значэньне набывае **гаспадарчы разрахунак,** захаваньне дагаворнай дысцыпліны, жорсткі кантроль рублём за выкананьнем абавязацельстваў бакоў, якія дагаворваюцца. На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што якасныя паказальнікі яшчэ далёка не знайшлі свайго месца ў радзе гаспадарчых дагавароў, нярэдка гэты бок справы з дагавароў проста выпускаецца. Фінансуючыя арганізацыі пытаньням выкананьня абавязацельстваў у частцы якасьці часта не аддаюць належнай увагі.

У нашым друку за апошні час апуб лікавана шмат матар'ялаў, якія гавораць аб нядобрым становішчы на вучастку якасьці ў прамысловасьці БССР.

Канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці павінны зьвяціць пераломным моментам у рабоце прамысловасьці. Адставаньне патрэбна неадкладна ліквідаваць ва што-б там ні стала.

Тыя вялізарныя дасягненьні, якіх рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам партыі, дабілася ў галіне індустрыялізацыі краіны, нябачаныя тэмпы прамысловага разьвіцьця павінны яшчэ больш павялічыцца поўным выкананьнем колькасных і якасных паказальнікаў у заключным годзе пяцігодкі.

Змагацца за кожны процант зьніжэньня сабекошту, выканаць заданьня па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы, даць спажыўцу добраякасную прадукцыю, выкараніць брак, — вось лёзунгі, пад якімі павінна прайсьці работа канфэрэнцый.

Ударнікам якасьці — бальшавіцкае прывітаньне!

8-мы дзень масавай генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы

БССР ВЫКАНАЛА ЗАДАНЬНЕ ПА ССЫПЦЫ НАСЕНЬНЯ ТОЛЬКІ НА 73,2 проц.

Разгортваючы бальшавіцкую самаправерку і бязьлітасна змагаючыся з кулаком і яго агентурай—правымі апартуністамі і „левакамі“, мабілізаваць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на сканчэньне складаньня насенных фондаў у бліжэйшыя-ж дні

АПІРАЮЧЫСЯ НА ПРАКТЫКУ ПЕРАДАВІКОЎ, ЛІКВІДАВАЦЬ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ АДСТАВАНЬНЕ

Апошняя пяцідзеўка дала недапушчальнае зьніжэньне тэмпаў ссыпкі насеньня. На 5 красавіка плян стварэньня насенных фондаў выкананы на 73,2 проц. супроць 72,8 проц. на 30 сакавіка — прырост складае ўсяго 0,4 проц. Гэта лічба — яркі паказальнік таго, што частка раёнаў ня толькі не разгарнула бальшавіцкай работы па фарсаваньні мабілізацыі насеньня, а, наадварот, дэмабілізавалася, не скарыстала генэральную праверку, якая пачалася 1 красавіка, для хуткай ліквідацыі адставаньня на гэтым важнейшым вучастку падрыхтоўкі да сяўбы.

Даволі адзначыць, што 11 раёнаў (імёны іх прыводзяцца ва ўвазе да зводкі НКЗБ) за першыя пяць дзён красавіка, як яны самі паведамілі, літаральна ніякага зруху ў ссыпцы насеньня і страхавых фондаў не дасягнулі. **Барысаўскі раён** даў зьмяншэньне ў ссыпцы насенных фондаў на 2,5 проц.

На ранейшым нізкім узроўні — ссыпка страхавых фондаў — 36,5 проц. заданьня.

Праз некалькі дзён паўднёвыя раёны, большасьць якіх увяходзіць у групу жыўёлагадоўча-канапляводчых раёнаў, пачнуць палявыя работы. Між тым, гэта група ўсё яшчэ цягнецца ў глыбокім тыле нават паўночных раёнаў. Паўднёвыя раёны выканалі заданьне па ссыпцы насеньня фондаў па ўсіх культурах у сярэднім толькі на 63,7 проц., яшчэ больш адстаючы па такіх культурах, як тэхнічныя (канопілі) — 47 проц.

Горш за ўсё стаіць справа са ссыпкай вятчай у БССР культуры — ільну. У той час, як па зборкавых заданьне па БССР выканана на 76,9 проц., па ільне—толькі на 49,1 проц.

Амаль зусім не посунулася наперад апрацоўка насеньня. На 5 красавіка гэтае прасьцейшае агра - мерапрыемства выканана толькі на 47,6 проц.

Зводка аб ссыпцы насеньня на 5 красавіка сьцвярджае аб сур'ёзных прарывах на самым адказным вучастку падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай вясны. Яна гаворыць аб тым, што частка раёнаў (Дрысенскі, Лагойскі, Лельчыцкі, Пярыцкі, Гомельскі і інш.) яшчэ не ўсьвядоміла неабходнасьці ўдесяцярыць тэмпы ссыпкі ў сувязі з сяўбой, якая павінна пачацца літаральна праз некалькі дзён.

Прыведзеныя вышэй лічбы адставаньня — неабвержны паказальнік таго, што ва многіх мясцох яшчэ не прыступілі да бальшавіцкага ажыцьцяўленьня ўказаньняў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і правільнай пабудове вытворчых брыгад, аб наладжаньні сыстэматычнага канкрэтнага кіраўніцтва і разгортваньня шырокай масавай работы, асабліва па лініі **забесьпячэньня поўнага выкананьня пасеўных плянаў аднаасобным сэктарам.**

Такое становішча абавязвае ўсе партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі неадкладна па справе ўключыцца ў генэральную праверку, каб мабілізаваўшы масы, усе сілы і сродкі, бязьлітасна змагаючыся з кулаком і яго агентамі — апартуністамі, у бліжэйшыя-ж некалькі дзён ліквідаваць адставаньні на вучастку насеньня. У сваёй рабоце раённыя і мясцовыя арганізацыі павінны апіраца на практыку пытаньняў перадавых саўгасаў і калгасаў і вёсак, якія правільна ажыцьцяўляючы дырэктывы партыі і шасьць указаньняў тав. Сталіна, даючы рашучы адпор кулаку і апартуністам усіх колераў, ужо поўнасьцю падрыхтаваліся да трэцяй бальшавіцкай вясны.

Уключыліся у праверку

ЦЕРАХАЎКА. Рэдакцыя Церахаўскай раённай газэты **«УДАРНІК КАЛГАСУ»** ўключылася ва ўсебеларускую генэральную праверку падрыхтаванасьці да сяўбы.

Пытаньне аб праверцы абгаворана на пасяджэньні РКК-РСІ, дзе выпрацаван плян правядзеньня праверкі. Створан штаб. Выпучана 25 брыгадзіраў для пасьпкі ў сельсаветы. Арганізавана брыгада для праверкі раённых устаноў.

Рэдакцыя «Ударнік калгасу»— ВЕДЗЬ.

РАЙКК-РСІ — ШЧАМЯРАЎ.
Райза — ВАРГАНАЎ.

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе засыпкі насенных фондаў па раёнах БССР на 5 красавіка 1932 г.

РАЁНЫ	У тым ліку: Засыпана у проц. да плану	Збожжавым	Тэхнічным	Бульбы	РАЁНЫ	У тым ліку: Засыпана у проц. да плану	Збожжавым	Тэхнічным	Бульбы
Асьвейскі	59,8	59,6	43,1	64,2	Плешчаніцкі	94,2	79,1	71,5	101,0
Бешанковіцкі	70,2	67,4	31,9	75,4	Пралойскі	60,7	67,0	65,8	60,2
Бялыніцкі	73,2	88,5	84,4	71,2	Пухавіцкі	60,9	83,3	36,9	58,0
Горацкі	68,8	74,6	38,4	70,9	Рагачоўскі	60,6	62,9	49,3	61,3
Вушацкі	67,8	59,5	27,2	75,0	Слуцкі	66,3	72,8	66,0	65,5
Гарадокскі	58,1	71,4	27,5	59,4	Смалявіцкі	59,7	63,8	46,8	60,2
Дрысенскі	42,8	53,2	36,4	39,6	Ст.-Дарожскі	80,7	62,7	31,3	63,8
Дубровенскі	69,3	74,6	42,0	74,1	Уваравіцкі	62,6	61,8	47,0	64,6
Крупскі	56,7	59,7	17,1	59,4	Церахаўскі	59,2	84,4	86,8	56,2
Лешчынскі	92,1	87,2	52,7	97,0	Чачэрскі	75,1	64,0	48,8	66,7
Лёзьненскі	78,2	85,4	56,7	80,9	Ч.-Слабодзкі	95,9	72,0	103,2	99,8
Мсьціслаўскі	97,1	100,5	47,1	103,1	Ч.-Польскі	69,9	74,0	74,3	69,6
Полацкі	67,9	86,6	44,0	66,0	Чэрвеньскі	79,4	80,8	66,4	80,4
Расонскі	56,2	57,8	20,5	61,4	Чэрыкаўскі	62,6	87,6	70,7	59,2
Сеньненскі	80,9	69,3	59,8	66,8	Брагінскі	72,0	75,3	59,1	71,4
Сіроцінскі	52,6	73,7	57,2	48,3	Гомельскі	67,9	76,7	43,9	68,2
Суражскі	67,5	66,1	28,8	70,5	Ельскі	80,7	95,9	73,9	78,8
Талачынскі	84,8	90,7	59,3	86,4	Жыткавіцкі	68,8	56,1	86,9	70,3
Чашніцкі	82,1	93,0	43,3	84,2	Камарынскі	84,3	61,5	80,6	85,5
Чашніцкі	60,3	61,8	38,2	61,6	Лельчыцкі	41,7	62,7	31,8	39,4
Шумілінскі	79,7	59,9	47,5	91,8	Лоеўскі	54,4	77,3	57,7	63,9
Асіпавіцкі	69,2	77,7	61,7	67,8	Мазырскі	63,5	56,2	47,4	66,4
Барысаўскі	48,9	64,4	41,9	47,1	Нараўлянскі	63,4	44,5	46,3	69,9
Бягомльскі	52,3	55,8	43,6	53,0	Парыцкі	40,3	50,2	41,2	39,8
Быхаўскі	56,2	61,8	54,5	56,6	Любаньскі	52,5	47,7	31,2	53,0
Б.-Канапляўскі	61,8	73,5	57,7	61,2	Пятрыкаўскі	51,5	38,2	41,2	55,2
Бярэзінскі	79,7	75,2	83,6	62,4	Речыцкі	67,2	61,4	32,9	70,3
Веткаўскі	59,9	76,4	89,2	59,3	Старобінскі	76,7	85,0	45,3	78,0
Вузьдзенскі	85,2	92,2	35,8	85,5	Тураўскі	56,9	50,0	59,5	58,1
Жлобінскі	57,8	64,7	66,2	57,5	Хойніцкі	73,5	77,8	27,3	76,3
Заслаўскі	69,7	80,0	44,7	71,0	Аршанскі	77,7	89,0	85,2	76,1
Карманскі	72,9	70,3	63,6	74,8	Бабруйскі	55,0	49,0	51,7	56,7
Касьцюковіцкі	63,8	70,7	59,3	62,8	Віцебскі	78,9	107,1	117,5	77,3
Клімавіцкі	80,3	70,9	49,3	83,8	Гомельскі	47,4	63,2	104,7	46,1
Клічаўскі	79,5	68,6	78,0	78,6	Магілеўскі	76,5	70,5	54,3	79,9
Койданаўскі	66,3	70,5	54,9	70,8	Менскі	81,8	90,1	—	83,4
Капыльскі	73,2	80,4	62,6	73,1					
Крычаўскі	81,3	100,5	62,2	80,1					
Лагойскі	50,8	94,9	41,8	45,6	Разам па БССР:	73,2	76,9	49,1	74,6

Увага: 1) Зводка на 5 красавіка 1932 г. складзена па 29 раёнах, па Рагачоўскім раёне ўключаны даныя па 30 сакавіка 1932 г., якія не ўвайшлі ў папярэднюю зводку.

2) 11 раёнаў іменна: Вушацкі, Сеньненскі, Чашніцкі, Вузьдзенскі, Карманскі, Плешчаніцкі, Пухавіцкі, Чачэрскі, Тураўскі, Старобінскі, Віцебскі паведамілі Наркамзем, што за пяцідзеўку з 30 сакавіка па 5 красавіка не адбылося ніякіх зьмен у засыпцы насенных і страхавых фондаў. Гэта сьведчыць аб дэмабілізацыйных настроях у даных раёнах у барацьбе за 100 проц. засыпку насенных і страхавых фондаў.

3) Барысаўскі раён даў зьмяншэньне засыпкі насенных фондаў на 2,5 проц. — гэта значыць разбазарыў насеньне.

4) Раёны-ж: Асьвейскі, Бялынецкі, Гарадокскі, Мсьціслаўскі, Расонскі, Чашніцкі, Асіпавіцкі, Быхаўскі, Б.-Канапляўскі, Бярэзінскі, Веткаўскі, Заслаўскі, Касьцюковіцкі, Койданаўскі, Капыльскі, Крычаўскі, Лагойскі, Пралойскі, Слуцкі, Смалявіцкі, Ст.-Дарожскі, Уваравіцкі, Ч.-Слабодзкі, Чэрыкаўскі, Брагінскі, Жыткавіцкі, Камарынскі, Лельчыцкі, Нараўлянскі, Любаньскі, Пятрыкаўскі і Рэчыцкі ўнарта не далі весткі, таму няма магчымасьці характарызаваць, як праходзіць работа ў адказьнейшы час нямногіх дзён, што засталіся да выхаду ў поле.

Кіраўнік посьўбюро НКЗБ ТАРАСЕВІЧ.

Штыхамі і прыкладамі польскі фашызм душыць забастоўку ў Петракове

Новыя тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу

ВАРШАВА, 8. Згортваньне працы емствуў і звальненьні рабочых набываюць у Польшчы ўсё больш шырокія разьмеры. **У Верхняй Сілезіі** ў сакавіку скарочана каля **6 тысяч горнякоў.** Гэтымі днямі закрылася цэлюлёзная фабрыка **«Патронас».** На мэталюргічным заводзе **«Байльдон»,** аб хуткім за крыцьці якога нядаўна было абвешчана, выбухнула забастоўка. **У Заверце** (Дамброўскі басэйн) на мэталюргічным заводзе «Заверце» адбылася бурная дэманстрацыя рабочых, якія пратэставалі супроць затрыманьня зарплаты. Рабочыя заняты на вытворчасьці толькі 2 дні на тыдзень і знаходзяцца ў выключна цяжкім становішчы. У **Ольчушы** (Келецкае ваяводзтва), з прычыны адсутнасьці замаўленьняў, у бліжэйшыя дні закрываецца завод эмаляваных вырабаў — **«Вэстэн».** 1.300 чалавек выкідваюцца на вуліцу.

Адміністрацыя гуты **«Гартэнзія» ў Петракове,** імкнучыся сарваць забастоўку рабочых, пачала вярбоўку штрэйкбрэхэраў для таго, каб 5-та красавіка часткова пусьціць завод у ход. Аднак, бастуючыя аказалі рашучае супраціўленьне штрэйкбрэхэрам. 5 красавіка, калі штрэйкбрэхэры зьявіліся на работу, яны былі прагнаны забастовачнымі пікетамі. На абарону штрэйкбрэхэраў зьявілася паліцыя. **Але забастоўшчыкі разагналі паліцэйскіх, закідаўшы іх каменьнямі і бутэльками.** Выкліканыя моцныя паліцэйскія падмацаваньні **штыхамі і прыкладамі зьбілі рабочых, арыштаваўшы больш 10 рабочых, у тым ліку 6 работніц. Паліцыя арыштавала таксама ўвесь забастовачны камітэт—усяго 20 чалавек.** У ночы на 5 красавіка **былі арыштаваны таксама ўсе члены праўленьня мясцовага прафэсыянальнага саюзу рабочых шкляной прамысловасьці. Сакратарыят саюзу апячатан.** Усяго ў сувязі з забастоўкай **у Петракове** за апошнія дні **арыштавана каля 100 рабочых.** Цяпер прадпрыемцы абвясьцілі аб закрыцьці гут **«Гартэнзія»** і **«Кара».** На гэтых заводах было занята каля 2 тысяч рабочых.

ПОЎНЫ ПРАВАЛ ЛЁНДАНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

БЭРЛІН, 7. Як паведамляе блізкая да ўраду Брунінга газэта «Германія», праграма запрапанаваная лёнданскай канфэрэнцыяй чатырох дзяржаў, у сваім зьмесьце мае наступныя пункты:

1. Ці павінна новая дунайская праблема ахапіць усяго толькі 5 краін: Аўстрыю, Вэнгрыю, Румынію, Югаславію і Чэхаславакію, ці да фэдэрацыі павінны быць прыцягнуты і інш. краіны?

2. Ці будуць дунайскія краіны, якія бяруць удзел у фэдэрацыі абмяркоўваць паміж сабою падрабязнасьці мытнага пляну.

3. Прапанову аб тым, каб прывілеі ў тарыфах, якія ўстанаўляюцца паміж дунайскімі краінамі, складалі, прыблизна, 10 і ня больш 12 проц.

4. Прапанова аб аказаньні бязадкладнай фінансавай дапамогі Аўстрыі і Вэнгрыі.

5. Аб кансалідацыі ўсіх заграніччных фінансавых абавязацельстваў дунайскіх краін і магчымасьці канверсіі гэтых абавязацельстваў.

6. Прапанова аб міжнародным фінансавым кантролі над бюджэтамі і далгамі дунайскіх краін.

Паводле вестак Англія і Францыя за выключэньнем аднаго ці двух пунктаў у цэлым **ня прышлі да згоды адносна гэтай праграмы.** Што датычыць прадстаўленьня дунайскім краінам пазыкі, дык вядома, што Англія канчаткова адхіліла свой удзел у запрапанаванай Францыяй пазыцы на 10 млн. стэрлінгаў і што зараз ведуцца перагаворы аб тым, каб Англія хаця-б частку гарантавала, а іменна 25 проц. гэтай пазыкі.

ЛЁНДАН, 8. **Як паведамляюць з Лёндану, канфэрэнцыя 4-х дзяржаў «адтэрмінавала» на неакрэсьлены тэрмін без указаньня месца аднаўленьня яе работ.**

КАТАСТРАФІЧНАЯ ПАВОДКА У БЭСАРАБІІ

Дзесяткі тысяч дамоў зьнесены вадою

ВЕНА, 8. Паводка ў Румыніі і Бэсарабіі з кожнай гадзінай набывае ўсё больш **катастрафічныя разьмеры. У Сароках** (Бэсарабія) вялікая частка гораду зруйнавана і ў тым ліку амаль усе грамадзкія будынкі і школы. У **Арадзе** вадой зьнесены 2 тысячы дамоў. Пад пагрозай зруйнаваньня знаходзіцца таксама і рэшта будынкаў. 12 тысяч жыхараў засталіся бяз прытулку. **Кішынёў** адрэзан ад усяго сьвету.

Прадмесьце Бухарэсту Сатплены зруйнавана. **40 чыгуначных ліній спынілі рух.** Паводле афіцыяльных даных, налічваецца пакуль што 50 ахвяр. Узровень вады ўсё яшчэ падымаецца. Румынскі ўрад, які затрачвае шмат мільёнаў на ваенныя падрыхтаваньні, ня прымаў ніякіх папераджальных мер для абароны насельніцтва ад паводкі. У сувязі з гэтым абурэньне насельніцтва зьвернута перш за ўсё супроць румынскіх улад. Як паведамляюць, ва многіх мясцох адбываюцца сутычкі паміж сялянамі, гарадзкім насельніцтвам і паліцыяй і жандарамі.

Паведамленьні аб паводцы паступаюць таксама з **Юга-Славіі. Рэкі Сава, Дрыма, Морава і рад іншых выступілі з берагоў.** Вялізарная колькасьць дамоў затоплены вадой. Шматлікая колькасьць дамоў зруйнавана. Чыгуначныя зносіны перарваны ва многіх мясцох. З Вэнгрыі таксама паступаюць весткі аб паводцы.

Францускія васалы арганізуюць „акупацыйныя карпусы“

Пробныя мабілізацыі ў Юга-Славіі, Румыніі

БЭРЛІН, 7. Левая пралетарская «Вольт Ам Абэнд» паведамляе, што Вэнгрыя на падставе тайнай згоды з Францыяй **атрымала права ўзбройвацца пры ўмове ўдзелу ў ажыцьцяўленьні інтэрвэнцыянісцкіх плянаў супроць СССР.**

У румынскай арміі фармуюцца асобыя **«акупацыйныя карпусы».** Ужо ствараецца адзін корпус з 3 дывізій, які пасьля мабілізацыі будзе напоўнены запасьнымі часьцямі. **Да гэтых акупацыйных войск будуць прыкамандыраваны прадстаўнікі польскай, югаслаўскай і чэха-славацкай арміі. У Юга-Славіі, пад кіраўніцтвам францускіх афіцэраў,** праводзяцца **пробныя мабілізацыі.** Францускія афіцэры накіраваліся зараз у Румынію, каб праводзіць там такія-ж пробныя мабілізацыі. У Бухарэсьце зараз знаходзіцца прадстаўнік францускага ваеннага канцэрну «Уніён Эропэен», які наглядае за будаўніцтвам новых цэхаў пры ваенных заводах (ТАСС).

ПРАВІЛЬНАЙ РАССТАНОЎКАЙ РАБОЧАЙ СІЛЫ—ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХІ СЯЎБЫ

БРЫГАДА № 1 КАЛГАСУ „РАСЬСЬВЕТ-ПЕРАМОЖЦА“ ЦЬВЁРДА ВЕДАЕ СВАЁ ВЫТВОРЧАЕ ЗАДАНЬНЕ

Калгас «Расьсьвет - пераможца», Жлобынскага раёну, практычна да арганізацыі вытворчых брыгад прыступіў з устанаўленьня вытворчых вучасткаў, на якіх павінны працаваць брыгады.

Кіруючыся тым, што вучасткі павінны быць найбольш сканцэнтраваны ў адным месцы вакол дэпэтру брыгад, уся тэрыторыя калгасу разьбіта па тры вучасткі.

У першым вучастку, дзе будзе працаваць брыгада № 1, зямельны вучастак устаноўлен у 502 гэктары, другі—182, трэці—188 гэкт.

Для таго, каб больш поўна паказаць структуру брыгад калгасу «Расьсьвет-пераможца», мы возьмем канкрэтна адну першую брыгаду, па прыкладзе якой пабудаваны іншыя брыгады.

Брыгада № 1 складаецца з 32 мужчын і 53 жанчын і атрымала наступнае вытворчае заданьне.

№№ п/п	НАЗВА КУЛЬТУР	Нумары клетак	Абём работ	Папярэдн. культуры	Даць ураджаю з 1 га (у цэнтнэрах)	Усяго урадж. (у цэнтнэрах)	Тэрміны выкананьня.
1	Бульба па гноі	VI	25	Авёс	138	2.450	12—20-V
	» па шт. угн.	III	102	Жыта	125	12.750	»
2	Пшаніца	IV	17	Прапашн.	8,5	144	10—12-V
3	Авёс	I	68	Жыта	11,8	743	1—12-V
4	Ячмень	I	13	Бульба	10,5	136	14—15-V
5	Грэчка	IV	10	Авёс	5	50	25-V
6	Сіласныя	III	12	Авёс	150	1.800	да 10-V
7	Віка	II	67	»	9	603	15—17-V
8	Канопліі	гар.	16	Авёс	3,3 в	52	18—20-V
9	Лён	IV	22	Канюш.	3	66	20—25-V
10	Падсеўн. канюш.	Авёс	50	—	—	—	12-V
11	Жыта 1932 г.	VII	95	Папар	—	—	да 15-IX
12	Уборка каюш.		14		35	490	10—15-VI
13	» азімых		122		10	1220	1--10-VIII
14	» сенажаці		144		3 т.	432	20-6-10-VII
15	» ран. ярав.		30				10—15-VIII
16	» позн. ярав.		190				15—30-VIII
17	» бульбы		127				1—14-X
18	Зяблевае ворыва і лушэньне		318				10-IX-I-X

З гэтай табліцы мы бачым, што, дзе і колькі павінна зрабіць брыгада, колькі брыгада павінна даць ураджаю з 1 гэктара і з усёй плошчы, што засяваецца.

У гэтым-жа заданьні ўказаны нумары клетак, дзе будзе сеяцца кожная культура.

Для выкананьня гэтага вытворчага заданьня брыгада № 1 атрымала цягавую сілу, інвэнтар, насеньне і інш.

Коняй 46, плугоў 20, барон 15, культыватара 3, жнівярак 1, снопавязак 2.

Таксама ў распараджэньне брыгадзіра перадаецца неабходнае насеньне для засеву. Аўса—126 цэнтн., ячменю—20 цэнтн., грэчкі—12 цэнтн., пшаніцы—26 цэнтн., вікі—77 цэнтн., ільну — 24 цэнтн., канапель — 20 цэнтн., кукурузы—6 цэнтн., бульбы—190 цэнтн., штучнага ўгнаеньня — 208 цэнтн. і 5.900 вагонаў гною.

Вышэйпералічаная колькасьць рабочай і цягавай сілы, інвэнтару і сродкаў вытворчасьці зараз ужо перададзены ў распараджэньне брыгадзіра першай брыгады тав. **Гаспадарэнка Емяльяна.**

На сваёй вытворчай нарадзе брыгада № 1 абгаварыла, як лепш расставіць сілы ўнутры брыгады. Брыгада разьбіваецца на 5 груп работнікаў. Кожная група ў часе веснавой сяўбы будзе працаваць на аднэй поўнай рабоце. Напрыклад, група баранавалокаў № 2 пасьля зімы баранае зяблевае ворыва, а ў гэты час аратыя аруць пад раньнія яравыя пасевы. Баранавалокі, скончыўшы работу па баравананьні зяблевага ворыва, перакідаюцца на работу па падрыхтоўцы глебы для пасеву яравых. Пасьля пасеўнай кампаніі баранавалокі перакідваюцца на баранаваньне пасеваў бульбы і падрыхтоўку папару і наогул па догляздзе расьлін.

Па такім-жа мэтадзе разьлічана работа кожнай групы. У часе ўборкі кожная група працуе на поўнай рабоце. Напрыклад, жніво, вязаньне снапоў, звозка снапоў, складаньне і г. д.

Кожны работнік на час яго работы атрымлівае ад брыгадзіра поўны інвэнтар і цягавую сілу. Напрыклад, Асмалоўскі Міхась працуе ў групе аратых; да яго прымацован плуг № 1 і пара коняй «Гняды» і «Арол». Увесь час сваёй работы Асмалоўскі працуе на гэтых конях і інвэнтары і адказвае за іх. Такім-жа чынам замацаваны за кожны работнікам поўныя сродкі вытворчасьці, якімі ён працуе і за якія адказвае.

Коні падзелены на групы. Першая —дужыя для цяжкіх работ, як ворыва, дыскаваньне, сяўба, перавозка цяжкіх грузаў і г. д., другая—слабасільныя—для выкананьня больш лёгкіх работ, як баранаваньне, падвозка лёгкіх грузаў і г. д.

Для догляду 46 коняй вылучаны два конюхі-фуражыры, якія даглядаюць і корміць коняй брыгады ў часе перапынку паміж работай.

Зараз ужо кожны работнік ведае, дзе і што ён будзе рабіць з выхадам у поле.

Брыгада № 1 цьвёрда ведае

Пяцідзеньнік агляду бюро скаргаў

УКЛЮЧЫМ У РАБОТУ ПА ПРАВЕРЦЫ І ЎМАЦАВАНЬНІ БЮРО СКАРГАЎ ШЫРОКІЯ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ

УСІМ ГАРКОМАМ І РАЙКОМАМ КП(б)Б

Падрыхтоўка да правядзеньня пяцідзеньніка агляду работы бюро скаргаў, дзейнасьць якіх мае вялізарнае значэньне ў справе барацьбы за зьнішчэньне недахопаў у рабоце партыйна-савецкага апарату і яго паляпшэньні, грахоўніц нездавальняюча. Вакол гэтай выключна важнай палітычнай кампаніі не мабілізавана шырокая пралетарская грамадзкасьць, калгасьнікі, рабочыя саўгасу, друк. Райкомы і гаркомы КП(б)Б не надалі належнага значэньня гэтай кампаніі і не аказваюць патрэбнай дапамогі КК-РСІ ў падрыхтоўцы пяцідзеньніка. ЦК КП(б)Б прапануе ўсім гаркомам і райкомам КП(б)Б зараз-жа прыняць меры да разгортваньня кампаніі, мабілізаваўшы шырокую грамадзкасьць на яе пасьпяховае правядзеньне

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Узьняць работу бюро скаргаў

Мы ўжо чыталі ў газэтах нататкі т. т. Сталіна, Молатава, Калініна і іншых правадыроў Савецкага Саюзу аб тым вялікім значэньні, якое мае ў справе паляпшэньня работы дзяржаўнага савецкага апарату работа бюро скаргаў.

Трэба адзначыць, што асабліва ў апошні час мы маем цэлы рад сьчалаў з месц аб тым, што ў паасобных зьвенях як нашага нізавога, так і раённага і цэнтральнага апарату ёсьць цэлы рад хваравітых зьяўленьняў бюракратызму, цягаціны, пядобрасумленных адносін да абавязкаў і замены арганізацыйна-масавай работы прубым адміністраваньнем.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што бюро скаргаў у БССР за апошні час ускрыла цэлы рад хваравітых зьяўленьняў у савецкім апараце і рашучым давядзеньнем да канца высьвятленьня гэтых зьяўленьняў і практычных посьпехаў бюракратызму і цягаціны ў апаратах сацыяльнічала паляпшэньню работы савецкага апарату.

Пяцідзеньнік па праверцы работы бюро скаргаў паміпен ашчэ ў большай меры садзейнічаць узьвіцьцю ролі бюро скаргаў у паляпшэньні работы апарату. У часе гэтага пяцідзеньніка трэба мабілізаваць увагу шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных да работы бюро скаргаў, растлумачыць ім значэньне бюро скаргаў, растлумачыць, што ў бюро скаргаў трэба ісьці ня толькі на сваёй асабістай справе, але і наогул скарыстоўваць бюро скаргаў у кожным выпадку выяўленьня ненармальнасьцей, парушэньня закону, палуўнасьці бюракратызму, цягаціны і г. д.

Я хачу асабліва падкрэсьліць, што для работы бюро скаргаў асабліваё значэньне мае ўказаньне Ўладзімера Ільліча Леніна—«лепш менш, але лепш». У адносінах да работы бюро скаргаў гэта павінна значыць, што бюро скаргаў, усяўшы тое ці іншае хваравітае зьявішча, павінна абавязкова вывучыць яго да самага канца, высьветліўшы прычыны ўзьнікнаваньня гэтага зьявішча, канкрэтных вінаватых у парушэньні закону, прыняць меры да выпраўленьня ненармальнасьцяй з тым, каб адпаведны закон ці дырэктыва былі цалкам выкананы, пацярпеўшы атрымаў законнае задавальненьне, а парушальнікі закону былі-б пакараны самым суровым парадкам.

Толькі такая работа бюро скаргаў будзе цалкам адпавядаць тэй ролі, якая вызначана ёй дырэктывамі партыі і ўраду, узьніме аўтарытэт бюро скаргаў у вачох шырокіх рабочых, калгасных і працоўных мас і створыць вакол бюро скаргаў актыў, апіраючыся на які бюро скаргаў будзе ашчэ з большым посьпехам выконваць свае задачы.

Больш увагі работе бюро скаргаў!

Больш увагі паляпшэньню работы нашага савецкага дзяржаўнага апарату!

Больш увагі задаваленьню законных запатрабаваньняў усіх працоўных!

Старшыня ЦВК БССР
А. Чарвякоў.

Разгортваюць работу

На шэйнай фабрыцы імя 8 сакавіка ніякай работы з актывам КК РСІ не вялося. Партколектыў і фабком ня ведалі, ці ёсьць на фабрыцы рабочыя заснацелі бюро скаргаў і як працуе «лёгкая кавалерыя».

Толькі зараз партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі разгарнулі кампанію па падрыхтоўцы да правядзеньня пяцідзеньніка агляду работы бюро скаргаў і па вярбоўцы актыву для работы ў РСІ.

На фабрыцы вылучаны брыгады па праверцы прамфінпляну на другі квартал і па праверцы рабочага спабжэньня. Па цэхах фабрыкі выходзяць штодзенкі, якія мабілізуюць усіх рабочых і работніц фабрыкі на лепшае правядзеньне пяцідзеньніка. Вярбуюцца лепшыя ўдарнікі ў партыю і прафсаюз.

Луганская.

Канкрэтнымі самаабавязацельствамі сустрэць пяцідзеньнік бюро скаргаў

На апошнім пасяджэньні пітабу па правядзеньні пяцідзеньніка бюро скаргаў, якое адбылося гэтымі днямі, былі заслуханы рапарты менскіх прадпрыемстваў, як яны рыхтуюцца да пяцідзеньніка. Па ўсіх прадпрыемствах арганізаваны спэцыяльныя брыгады, якія правяраюць работу пастоў, бюро скаргаў, арганізуюць атрады «лёгкай кавалерыі», мабілізуюць новы актыў, выпускаюць спэцыяльныя шматтыражкі.

На першым месцы ідуць: шчотачная фабрыка, фабрыка «Кастрычнік», заводы: «Камунар», «Полымя рэвалюцыі», хэмфармзавод і завод імя Варашылава.

На менскай шчотачнай фабрыцы за апошнія дні арганізавана 6 новых брыгад з 36 добраахвотнікамі, якія правяраюць выкананьне санпрылістычных дагаворэў, выкананьне прамфінпляну і работу гаспадарча-разрахунковых брыгад. Фабрыка абавязалася да 1 мая выканаць плян другога кварталу.

(БЕЛТА).

ПАШЫРЭНЬНЕМ ПАСЕВАЎ КАРМОВЫХ КУЛЬТУР, УМАЦАВАНЬНЕМ КАЛГАСНЫХ ФЭРМ

адказваюць калгасьнікі на пастанову ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

Арганізаваць дапамогу калгасьнікам у набыцьці жывёлы

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру СССР

У ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка Калгасцэнтр прапануе ўсім рэспубліканскім, краявым і абласным калгасаюзам:

разгарнуць шырокую кампанію па растлумачэньні калгасьнікам пастановы ЦК УсеКП(б) аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы і на падставе гэтай пастановы павесьці рашучую барацьбу супроць усялякіх спроб прымусовага аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьніках, прыцягваючы да суровай судовай адказнасьці вінаватых у парушэньні ўказанай пастановы ЦК УсеКП(б) і статуту сельска-гаспадарчай арцелі.

Арганізаваць дапамогу калгасьнікам, якія ня маюць кароў і дробнай жывёлы, у набыцьці прадукцыйнай жывёлы шляхам продажу частці маладняка ўласнага прыплоду з таварных фэрм, куплі маладняка ў сялян, якія маюць дарослую жывёлу і маладняк.

Разгарнуць работу спод калгасьнікаў аб дапатковай мабілізацыі ў калгасныя насенныя фонды насеньня аўса, ячменю, траў і кораніплодаў для дадатковага папаўненьня кармовай калектыўнай базы. Дабіцца высоўваньня з боку калгасаў сустрэчных пляноў па сіласаваньні з разьліку забясьпечыць сіласам ня толькі таварнае аграмаджанае стада, але і стада калгасьнікаў.

З прычыны вялізарнай важнасьці злучнай кампаніі ў справе вытворчасьці і лікаснага паляпшэньня жывёлы, тэрмінова праверыць давядзеньне пляну злучнай кампаніі да калгасу, вылучыць спэцыяльных людзей, адказных за арганізацыю і правядзеньне злучкі, у максымальнай меры скарыстаць палепшаных вытворнікаў і асабліва штучнае апладненьне. Калгасныя таварныя фэрмы абавязаны аказаць усямерную дапамогу ў правядзеньні злучнай кампаніі і скарыстаць для гэтай мэты склад вытворнікаў, які ёсьць на фэрмах.

Па лініі сьвінагадоўлі, аўчагадоўлі, птушкагадоўлі і трусагадоўлі абавязаць спэцыяльныя цэнтры і калгассаюзы шырока практыкаваць абмен калгасьнікам племянной маточнай жывёлы, якая ёсьць на фэрмах звышплянаў фарсаваньня з тым, каб гэту племянную жывёлу пакінуць на гадоўлю ў калгасьніках, атрымліваючы замест не ад калгасьнікаў мясную жывёлу для здачы дзяржаве.

Арганізаваць праз вэтэрынарны пэрсанал калгассаюзаў, калгасаў і таварных жывёлагадоўчых фэрм вэтэрынарнае зоатэхнічнае абслугоўваньне жывёлы, якая знаходзіцца ў калгасьніках.

У пасьбішчны пэрыяд для жывёлы калгасьнікаў, а там, дзе ёсьць таварныя жывёлагадоўчыя фэрмы,—для жывёлы гэтых фэрм, вызначыць самастойныя пасьбішчныя вучасткі.

Абласным і раённым калгассаюзам, па ініцыве з жывёлагадоўчымі цэнтрамі, павесьці работу па далейшым пашырэньні стада таварных жывёлагадоўчых фэрм на базе ўжо аграмаджанай жывёлы ў калгасах, у якіх не арганізаваны яшчэ жывёлагадоўчыя фэрмы, шляхам стварэньня фэрм у гэтых калгасах, з пазўчай аграмаджанай жывёлы калгасаў і папаўненьня гэтых фэрм маладнякам за лік куплі і перадачы выгадаванага маладняка ад больш буйных фэрм.

Праўленьне Калгасцэнтру прапануе ўсім рэспубліканскім, краявым, раённым калгассаюзам і праўленьням калгасаў, на аснове пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка, павесьці шырокую масавую растлумачальную работу спод калгасьнікаў, павышаючы іх актыўнасьць і самадзейнасьць у справе разьвіцьця жывёлагадоўлі, балыпавіцкага правядзеньня весьнавой сяўбы, вялучы адначасова рашучую барацьбу як супроць «лівацкіх» загібшчыкаў, штурхаючых на прымусовы парадак аграмаджаньня жывёлы ў калгасьніках, так і кулацкіх элементаў, якія прабуюць асабліва разьвіцьцё калектыўнай сацыялістычнай жывёлагадоўлі, што арганізуецца ў таварных жывёлагадоўчых фэрмах.

Старшыня Калгасцэнтру СССР і РСФСР ТАТАЕЎ.

Пастанова ЦК выклікала новую хвалю працоўнага энтузіязму

ГОМЕЛЬ, 8. (Па тэлефону).

Па калгасах Улукаўскага і Прыбыткаўскага сельсаветаў, Гомельскага прыгараднага раёну, шырока разгарнулася прапрацоўка пастаноў ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка 1932 году і ЦК КП(б)Б аб забароне прымусовага аграмаджаньня жывёлы.

Мерапрыемствы партыі і ўраду, якія накіраваны на вырашэньне жывёлагадоўчай і мясной праблемы, на карэннае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых і калгасьнікаў, выклікалі ўхваленьне з боку калгасьнікаў і бедняцкоў і серадняцкоў—аднаасобнікаў і магутную хвалю энтузіязму, накіраваную на падрыхтоўку да весьнавой сяўбы.

Па Улукаўскім сельсавеце пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б прапрацаваны ў калгасах «Чырвоная воля», «Гомельскі авіятар», «Клім Варашылаў» і «Чырвоны Кастрычнік». У гэтых калгасах намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па пашырэньні кармовай базы для забесьпячэньня кармамі ня толькі абагуленага стада, але і жывёлы калгасьнікаў.

Калгасьнікі Улукаўскага сельсавету прапрацоўку пастановы аб забароне прымусовага аграмаджаньня жывёлы ўвязалі з генэральнай праверкай гатоўнасьці да сяўбы. На сёньняшні дзень гэтыя калгасы амаль поўнасьцю гатовы да сяўбы, забясьпечаны насеньнем, інвэнтаром і г. д.

Толькі адзін калгас «Чырвоная зорка», гэтага сельсавету, да гэтага часу яшчэ не прапрацаваў пастановы. Парт'ячэйка і праўленьне калгасу правялі поўную апартуністычную бязьдзейнасьць у гэтым напрамку. Старшыня калгасу Драздоў ня толькі не забясьпечыў сваячасовай ўкі калгасьнікаў на сход, прысьвечаны прапрацоўцы пастановы ЦК УсеКП(б), але і сам не зьявіўся. У выніку сход быў сарваны.

У гэтым калгасе на сёньняшні дзень не хапае кармоў для жывёлы малочнай фэрмы. Цяляты дагадоўваюцца вельмі дрэнна.

За-захаваньне і правільнае выдаткаваньне кармоў ніхто не адказвае. Усю зіму кармы бралі бяз усякага ўліку хто колькі хацеў. Падрыхтоўка да сяўбы ідзе марудным тэмпамі. Інвэнтар яшчэ не падрыхтаваны.

Сваячасовае давядзеньне пастановы партыі да кожнага калгасу, да кожнага аднаасобніка зьяўляецца чарговай і неадкладнай задачай усіх сельскіх парт'ячэек Гомельскага прыгараднага раёну, асабліва калі ўлічыць, што пры аграмаджаньні жывёлы ў некаторых калгасах былі дапушчаны перагібы.

Вось некалькі характэрных фактаў. Праўленьне калгасу «Чырвоны герой», Сьвятлавіцкага сельсавету, зусім ня лічыла вынесла пастанову аб прымусовым аграмаджаньні цялят пасьля 3-х месячнага ацёлу. У гэтым калгасе ёсьць 150 гаспадарак. Праўленьне калгасу да гэтага часу амаль зусім не ўжывала ніякіх мер для стварэньня адпаведных умоў калгасьнікам у справе гадаваньня маладняка, у пашырэньні кармовай базы і г. д. У калгасе «Клім Варашылаў» у часе ўступленьня бедняцкоў-аднаасобнікаў у калгас практыкавалі аграмаджаньне апошняй каровы.

Трэба адзначыць, што пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б паасобнымі калгасамі падчас прапрацаваны фармальна, без памячэньня канкрэтных мерапрыемстваў па выпраўленьні малочных месца перагібаў, без памячэньня шляхоў хутчэйшага ўкамплектаваньня малочных і сьвінагадоўчых фэрм, пашырэньня кармовай базы, па дапамозе калгасьнікам-бедняком у набыцьці жывёлы і г. д. Асабліва гэта зьяўляецца характэрным для тых калгасаў, дзе былі найбольшыя скрыўленьні пры абагульваньні жывёлы як, напрыклад, у калгасах «Чырвоны герой», «Пралетары», «Чырвоная зьмена».

Перадавыя калгасы раёну ўжо адказалі па пастанову ЦК УсеКП(б) канкрэтнымі мерапрыемствамі па пашырэньні пасеваў кармовых культур. Трэба дабіцца, каб гэты важнейшы дакумант быў дэталёва абмеркаван ва ўсіх калгасах. Абмеркаваньне пастановы ЦК павінна суправаджацца выпраўленьнем перагібаў, папушчаных пры аграмаджаньні жывёлы, дапамогай калгасьнікам у набыцьці жывёлы, узмацненьнем тэмпаў падрыхтоўкі да сяўбы і замацаваньнем калгасных таварных фэрм.

Гафт.

Калгас „Новае Лядцо" пашырае пасевы кармовых культур

Калгасьнікі с.-г. арцелі «Новае Лядцо», Пухавіцкага раёну, Новасёлкаўскага сельсавету, дэтальна абмеркавалі па агульным сходзе пастанову ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка і ЦК КП(б)Б ад 3 красавіка і цалкам ухвалілі іх як мерапрыемствы, накіраваныя на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Для практычнага ажыцьцяўленьня гэтай пастановы ва ўмовах калгасу «Новае Лядцо» агульны сход даручыў праўленьню калгасу дапамагчы набыць карову калгасьніцы-беднячкі Андросік Зосі, у якой загінула карова.

Сход жорстка крытыкаваў праўленьне калгасу за надбайнае і нерацыянальнае скарыстаньне кармоў.

Для забесьпячэньня кармамі жывёлы як аграмаджанай, так і неаграмаджанай калгас цалкам прыняў плян райкалгассаюзу па засеве кораніплодаў і бульбы, у якім прадугледжана пашырэньне плошчы пад гэтымі культурамі.

У калгасе ёсьць укосных кармовых траў 114 га. У гэтым годзе будзе пасеяна 62 га капюшны (павялічэньне супроць мінулага году на 2 га), кораніплодаў — 16 га (пашырэньне на 8 га), вікі — 17 га, сэрадэлі — 12 га, сіласных культур — 10 га.

Для правільнага догляду за ацёлам калгасьнікі пастанавілі ў аборы зрабіць асобнае памяшканьне для тых кароў, якія пайшлі цяліцца. Уведзен правільны ўлік злучкі.

Л. Я.

Ліквідаваць непрадукцыйныя прастоі!

Павышэньнем эфэктыўнасьці работы вагоннага і паравознага паркаў забясьпечым выкананьне плянаў перавозак

Не змагаюцца за павялічэньне звароту вагонаў

У пастанове кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб транспарце сказана: «Павінна быць забясьпечана рашучая барацьба за беражлівае скарыстаньне транспартных сродкаў, вагонаў і паравозаў, скарачэньне ўсякіх прастояў пад пагрузкай і выгрузкай».

Гэта важнейшая дырэктыва партыі ня ўсюды выконваецца. Станцыя Віцебск не захоўваюцца. Цягнікі на Ленінград і Смаленск фармуюцца няправільна. 21 сакавіка з цягнікам № 702 у заходні сэктар было пастаўлена 26 вагонаў у двух месцах. Ва ўсходні сэктар 12 вагонаў і ў цэнтральны сэктар 21 вагон таксама ў двух месцах. Такое прыкладна фармаваньне выяўлена брыгадай і 25 сакавіка ў цягніку № 786.

Жыўнасьць, лежнікі і цыстэрны на вінны, паводле загаду Наркамшляхоў эпосін, адпраўляцца выключна з цягнікамі №№ 632, 634 і 750. Між тым, іх прычапляюць ваза ад да зборных. 29 сакавіка да цягніка № 772 былі прычэплены вагоны з жыўнасьцю, і хаця ўпаўнаважаны НКШЗ цягнік гэты забракаваў, усё-ж адміністрацыя яго адправіла.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што работа кіраўніцтва эксплёатацыі як раёну, так і станцыі яшчэ не перабудавана. Рэжысёраў у нізох амаль ня відаць.

Грамадзкая думка не мабілізавана вакол задач барацьбы з прастоямі, за поўнае скарыстаньне вагоннага парку. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі яшчэ ня сталі на чале барацьбы за выкананьне загаду паркома па гэтым пытаньні.

Неабходна, каб паміж камэрцыйнай і эксплёатацыйнай службамі была заключана ўмова, паводле якое за кожнае лішняе затрыманьне вагона нізаваты нёс-бы матар'яльную адказнасьць. Кантроль рублём зьявіцца важнейшым сродкам поўнай нагрузкі вагонаў і ліквідацыі прастояў.

Брыгада друку: **Ганчареў, Ангорскі.**

Калінкавічы ігнаруюць маршрутызацыю

Гомель недагружае цягнікоў

ЖЛОБІН. (Наш спец. кар.). Адміністрацыя станцыі Калінкавічы ня выконвае дырэктывы ўраду аб маршрутызацыі цягнікоў. 18 сакавіка на ст. Жлобін прыбыў з Калінкавіч цягнік № 888. У ім былі раскіданы ў 6 месцох вагоны на Ленінград, і на Віцебск і ў 2 месцох вагоны на Менск. 20 сакавіка ў цягніку № 876 вагоны на Ленінград былі раскіданы ў 5 месцох, на Віцебск—у 4-х, Менск—3-х і Жлобін—у 3-х.

Такое счапленьне вагонаў затрудняе работу пунктаў перадачы і сартоўкі. Замест таго, каб адразу адчапіць цэлую групу вагонаў і прычапіць да другога адпаведнага цягніка, прыходзіцца разьбіваць увесь састаў, выбіраць патрэбныя вагоны і счапляць іх паміж сабою.

У выніку гэтага ёсьць агульны недапрабег вагонаў, зрыў графіку сьлядаваньня таварных цягнікоў, прастой вагонаў на запасных шляхох і г. д. Ёсьць таксама факты, калі ў выніку заграмаджэньня вагонамі праезных шляхоў стварэецца пробка і бываюць здарэньні.

Трэба адзначыць, што станцыя Гомель вельмі часта недагружае цягнікі. 15 сакавіка цягнік, які пакінен быў важыць 1.030 тон, меў нагрузку 819 тон. 16 сакавіка—774 тоны, 18 сакавіка—875, 19 сакавіка—890. Такім чынам, дырэктывы партыі і ўраду аб найбольш эфэктыўным скарыстаньні паравозаў і вагонаў, аб поўнай нагрузцы вагонаў ня выконваюцца.

П. Н.

Па віне дыспэтчараў затрымліваюцца паравозы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Па віне дыспэтчараў мае месца рад затрымак паравозаў.

23 сакавіка ў Калінкавіцкім зваротным дэпо паравоз 6751 быў затрыманы больш нормы на 9 гадз. 40 мін., 26 сакавіка ў Гомельскім зваротным дэпо паравоз 7090—на 1 гадз. 45 мін., пасьля чаго быў адпраўлен у Гомель рэзервам. У той-жа дзень у 7 гадзін са Оноўску адпраўлен рэзервам паравоз 1510. У 22 гадз. 30 мін. таго-ж 26 сакавіка паравоз Щ-1656 быў адпраўлен з Гомеля ў Оноўск і 27 сакавіка—з Гомеля на Оноўск адпраўлен паравоз Щ-2055, які зьвярнуўся ў Гомель рэзервам.

Трэба пакончыць з гэтай злачынай дыспэтчарскай бытаўшчынай, якая прыводзіць да непрадукцыйнай гонкі паравозаў, да дарожнага спальваньня вугалю.

С. Латін.

128 гадзін чаканьня і 3 гадзіны рамонту

Рамонтны пункт станцыі Жлобін не праводзіць аналі ніякага рамонту вагонаў. 25-га і 26 сакавіка адпраўлены па Магілёў цягнікі з зусім не адрамантаванымі вагонамі.

Неабходна адзначыць, што вагоны, якія паступаюць у адчэпку на ст. Жлобін, пераганяюцца з месца на месца па некалькі раз, пакуль трапляюць у рамонтны пункт. Бываюць выпадкі, што вагоны блукаюць на 5 сутак, пакуль ставяцца на рамонт. Наогул трэба адзначыць, што ніякай плянавасьці ў рабоце пункту няма. Вагоны прастойваюць, чакаючы рамонту, больш, чым у самым рамонце. Вагон № 614952 чакаў рамонту 128 гадзін, а рамантаваўся ўсяго толькі тры гадзіны. Майстар пункту тав. Мацьніпаў спасылаецца на аб'ектыўныя прычыны і зусім ня прымае ніякіх мер да ліквідацыі такой абураючай пастаноўкі работы.

Ніякіх мер да мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў ня прымаецца. На станцыі валяюцца 244 рэсоры, 40 буферных стаканаў, 50 букс верхніх і г. д. Брыгада па ўтылізацыі матар'ялаў працуе дрэнна. Скрынкі для хаваньня запасных частак на шляхох не скарыстоўваюцца, ня гледзячы на тое, што на выраб іх патрачана шмат сродкаў.

На пункце адсутнічае кантроль за выкананьнем рамонту. Адзоль якасьці яго зусім ніякая. Трыкутнік пункту не аддае належнай увагі ліквідацыі ўсіх перамічаных недахопаў.

Памфіловіч.

Сустрэчныя перавозкі ў Лепелі

Кліентура Лепельскай чыгункі несвячасова разгружае вагоны з грузамі, якія атрымліваюцца на яе адрас. Таксама пагледзіцца сустрэчныя перавозкі. Бягомльскі райсаюзхлеб грузіў вагон ячменю на працягу двух сутак. Лепельскі лесрабкоп 14 і 15 сакавіка выгрузіў 12 вагонаў аўса, а 17 сакавіка загрузіў у Полацак 8.

49 і 52 конны транспарт Белдарбудаўніцтва несвячасова вывозіць грузы. На працягу 5 дзён лежыць нявывезеных два вагоны сена і вагон салому.

На 1 красавіка на станцыі лежалі грузы наступных адрасатаў: лепельскай базы белдарбудаўніцтва з 23 сакавіка—1.237 кгр., лесрабкопу з 27 сакавіка—974 кгр., лепельскай вэтлячэбніцы—400 кгр. і г. д. Адміністрацыя станцыі ня прымае рашучых мер, каб разгрузіць пакгаузы.

Машніцкі.

Дрэнна арганізавана работа

На абменным пункце Ворша-ўсходняя адсутнічае адзінаначальне, панує поўная абязьлічка, не праводзіцца гас падарчы разрахунак.

У часе агляду і рамонту вагонаў састаў не агародзваецца сыгналамі. У выніку ёсьць факты, калі паравозы зьбіваюць саставы з месца і прыводзяць да пашкоджаньня людзей, якія заняты аглядам і рамонтам вагонаў.

Абменны пункт мае спэцыяльны вагон-цялушку № 451960, які вызначан для перакідкі матар'ялаў з Воршы-цэнтральнай. Адзак, гэты вагон больш часу прастойвае, чым скарыстоўваецца. Пры тым становішчы, калі з Воршы-цэнтральнай на Воршу-ўсходнюю кожныя суткі ходзіць калі 4-х саставаў, зусім свабодна можна было перадаць вагон-цялушку для лепшага скарыстаньня.

Трэба адзначыць, што на абменным пункце зусім ніякая працоўная дысцыпліна, што ніякіх мер барацьбы з парушэньнямі ня прымаецца.

Парткалектыў і прафсаюзная арганізацыя павінны рашуча перабудаваць работу пункту, выходзячы з тых вялікіх задач, якія станцыі перад ім.

С.

Да канца вытруціць „нэпманскі дух"

Не дапускаць скажэньняў савецкай палітыкі цэн

Праверка становішча цэн і нацэнак па спажывецкай кааперацыі і дзяржгандлі БССР выкрыла рад фактаў грубага парушэньня дырэктыў партыі і ўраду. Існуючы парадак цэнаўтварэньня і калькуляцыі цэн у радзе гандлюючых арганізацый ні ў якім разе не забясьпечвае санкцыянаванага правядзеньня прынцыпаў савецкага гандлю. Гандлюючыя арганізацыі зусім ня маюць запэўднаных разьмераў нацэнак. Ёсьць шмат выпадкаў, калі цэны ўстанаўляюцца «на вока», у залежнасьці ад волі рахункавода-калькулятара.

Цэнаўтварэньне і калькуляцыя цэн вастаюцца закінутым вучасткам работы. Ні Наркамснаб, ні Белкаапсаюз гэтым пытаньнем як належыць не займаліся. У гандлюючых арганізацыях няма дакладных установак аб прынцыпах устанаўленьня раздробных цэн, аб граничных нацэнках на тавары, аб нормах выдаткаў таваразвароту і г. д.

Частка гандлюючых і кааперацыйных арганізацый усё яшчэ карыстаецца пры нацэнках зборнікам Наркамгандлю «Ад граничных надбаўках на прамтавары», выд. 1926 г., складзеным шкоднікам Найтусам. Зборнік дагэтуль Наркамснабам не скасаваны. Пакольку Наркамснаб аддае ўвагу пытаньню аб цэнах, відаць з таго, што бюро цэн пры Наркамснабе, якое павінна складацца з 5 асоб, зусім не ўкамплектавана. У бюро працуе толькі 1 работнік.

У практыцы гандлюючых і кааперацыйных арганізацый пагледзіцца частыя выпадкі пяўзаклівых адносін да калькуляцыі, перадзверка калькуляцыі тэхнічным і безадказным работнікам, якія часта зусім ігнаруюць нормы, дадзеныя кіраўнікамі гэтых устаноў. Свавольле ў нацэнках прыводзіць да таго, калі ў межах аднаго і таго-ж гораду або населенага пункту наглядаецца надзвычайная стракатасьць цэн.

Вось некаторыя дадзеныя з матар'ялаў дзяржаўнай інспэкцыі цэн пры НК РСІ.

У краме паляўнічых Чэрвеньскага раёну прадаецца мыла аднэй вагі і гатунку па розных цэнах — 75 кап., 86 кап. і 93 кап. кавалак. У Жлобіне парловыя крупы замест устаноўленых «Саюзкрупой» 45 кап. прадаюцца ў ТСТ па 43 кап., райсаюзе — 47 кап. і лесарабкопе — 49 кап. кгр.

У Менску, ня гледзячы на тое, што ўсе гандлюючыя арганізацыі адпускаюць квашаную капусту па 14 кап. кгр., Белгандаль чамусьці прадае па 18 кап.

Ня лепш і з нацэнкамі. На мануфактуру ў гандлюючых і кааперацыйных арганізацыях Горацкага раёну робіцца наступныя нацэнкі: па райсаюзе — 9 проц., Белгандлі — 10 проц., гарспажыўтаварыстве — 15 проц. і лесарабкопе — 19 проц. Па абутку: лесарабкоп — 9 проц., райсаюз—12 проц., Белгандаль — 15 проц. У Чэрвеньскім раёне на гатовую вопратку гарспажыўтаварыства робіць нацэнкі 28 проц., а ў лесарабкопе нацэнка даходзіць да 50 і вышэй процантаў.

Повышадкова, калі на агульным сходзе работнікаў Белгандлю ўзьнікаюць спрэчкі паміж бухгальтэрыяй і аперацыйнымі работнікамі аб тым, хто ў іх кіруе і нясе адказнасьць за ўстанаўленьне цэн і нацэнак ва ўсёй сыстэме. У апараце Белгандлю і ў некаторых кааперацыйных арганізацыях гэты адказьнейшы вучастак работы знаходзіцца ў руках выпадковых работнікаў.

Скажэньні савецкай палітыкі цэн ва многіх выпадках зьяўляецца вынікам праяўленьня нэпманскага духу, ігнараваньня інтарэсаў і запатрабаваньняў спажыўца, захапленьня нэпманскім гандлем і ўздуваньня цэн у пагоні за высокімі прыбыткамі.

Чэрвеньскі лесарабкоп па закупленыя па мясцовай швэйнай фабрыцы «Новы шлях» тавары на суму 2.842 руб. робіць нацэнку 80 проц. на сабекошт. У выніку пагоні за высокімі прыбыткамі мы маем і такія факты, калі магазын Белгандлю ў Менску атрымлівае прыбытак 8-9 проц. да агульнай сумы і таваразвароту, замест вызначаных 2-2,2 проц., а магазын Белпушніны ўмудраецца атрымаць за 1931 год прыбытку 30 проц. да агульнай сумы таваразвароту. Белгандаль, атрымаўшы муку, робіць на яе накідку ў 16 проц., выпякае з мукі булкі і робіць дадаткова нацэнку ў 16 проц. на булкі. У закусачных, дзе гэтыя булкі прадаваліся, нацэнкі рабіліся ўжо ў трэці раз.

Ёсьць і такія выпадкі, калі гандлярскія элемэнты з Белгандлю, атрымаўшы мясныя вырабы (магазын № 1 у Менску) па цвёрдых цэнах на суму 2.795 руб. умудрыліся сплавіць гэтыя тавары на камэрцыйных цэнах на суму 7.293 руб.

Ёсьць факты і простага ашукваньня пакупца шляхам абмеркаваньня і абважваньня пры водпуску тавараў. Выяўленьня выпадкі злоўжываньняў пры водпуску газы ў Менску з усёй выразнасьцю сьведчаць аб наяўнасьці злачыннага элемэнту сярод загадчыкаў магазынаў і работнікаў прылаўку. Зроблены налёт на газавыя крамы выявіў, што адпускаецца 18 літраў замест 20, 9 літраў замест 10 і г. д.

Прадавец ларка № 9 МЦРК у сваёй заяве па гэтым пытаньні піша наступнае: «З першых дзён маёй працы ўсё ішло так, як ён (загадчык магазыну Глябанаў) мяне вучыў, як налівацъ. Апускай шклянку дном уніз, атрымліваюцца буркалькі, хутка падхапляй і налівай пакупцу. Гэтым спосабам атрымліваецца ня поўны літар... Здачы капейку-дзьве не давай». Налётам устаноўлены выпадкі спэкуляцыі і разбазарваньня газы. (Крама № 79).

Такое становішча ў далейшым зьяўляецца нецярпімым. Палітыка цэн, як адно з важнейшых пытаньняў савецкага гандлю, павінна быць пастаўлена ў парадак дня Наркамснабу, гандлюючых і кааперацыйных арганізацый. Трэба павесьці рашучую барацьбу з усялякімі скажэньнямі ў справе цэн і нацэнак. Трэба зьвінчыць абязьлічку ў цэнаўтварэньні і калькуляцыі цэн, ліквідаваць такое становішча, калі невядома хто ўстанаўляе і нясе адказнасьць за цану ў магазыне. Неабходна рашуча ўдарыць па тых апартуністычных элемэнтах з гандлёвага апарату і органаў Наркамснабу, якія процістаўляюць савецкі гандаль плану і тым самым скочваюцца да буржуазнага «чыстага гандлю», што ярка выяўляецца ў імкненьні паасобных работнікаў кааперацыі і гандлю да звышпрыбыткаў і ігнараваньня інтарэсаў рабочага спажыўца.

Для нагляду за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду па ўстанаўленьні раздробных цэн у гандлюючых арганізацыях і для барацьбы з рознага роду скажэньнямі ў галіне цэн пры НК РСІ БССР створана дзяржаўная інспэкцыя цэн.

Інспэкцыя цэн, апіраючыся на шырокую грамадзкасьць і, у прыватнасьці, на актыў крамных камісій і кааперацыйных бюро, павінна запатрабаваць ад кожнага магазыну, разьмеркавальніка выкананьня пастановы камітэту цэн пры СНА аб вывешваньні на відным месцы дакладных прэйскурантаў і дабіцца выстаўленьня ярлыкоў цэн на тавары.

Ні ў якім разе нельга дапускаць продажу аднолькавых тавараў па розных цэнах, каб гэтым самым зьнішчыць магчымасьць для злоўжываньняў з боку загадчыкаў магазынаў і паасобных работнікаў прылаўку.

У барацьбе за правільную арганізацыю культурнага савецкага гандлю трэба рашуча змагацца з адвольным павышэньнем продажных цэн і продажам гуртом па раздробных цэнах. Такога роду аперацыі гандлюючых арганізацый часта робяцца пад шыльдай самазагатовак, чым па сутнасьці скажаецца ня толькі сапраўдны сэнс самазагатовак, але ўся савецкая палітыка цэн. Не павінна быць такога становішча, калі Луначарскае сельспажыўтаварыства, Дрысенскага раёну, прыводзіць «самазагатоўкі» ў іншых раздробных гандлюючых арганізацыях і робіць нацэнку на гэтыя тавары на 40 і больш процантаў.

Імкненьні да звышпрыбыткаў—характэрная рыса капіталістычнага гандлю. Зачада-ж сыстэмы савецкага гандлю — найбольш тапае і хутчэй прасоўваньне тавараў ад вытворчасьці да спажыўца. Трэба ў корані вывесьці імкненьні паасобных работнікаў гандлёвай сеткі прадаваць тавары сельскага фонду ў гарадох і назваротаў.

Толькі пры актыўнай дапамозе з боку ўсіх партыйных і прафэсіянальных арганізацый, усёй пралетарскай грамадзкасьці інспэкцыя цэн зможа з посьпехам змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб савецкай палітыцы цэн, з тымі злоўжываньнямі, якія яшчэ маюць месца ў раздробным савецкім гандлі.

А. ШАУРОЎ.

Да ўсебеларускай канфэрэнцыі па якасьці прадукцыі лёгкай прамысловасьці

ВІЦЕБСКІЯ ШВЭЙНАЯ І АБУТКОВАЯ ФАБРЫКІ ЯШЧЭ СЛАБА ЗМАГАЮЦЦА ЗА ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ

„Партыйныя, прафэсыянальныя, савецкія і каапэрацыйныя арганізацыі павінны паставіць работу па паляпшэньні якасьці прадукцыі, як адну з важнейшых задач" (з рэзалюцыі Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б)

Дзе якасьць работы на апошнім пляне

ВІЦЕБСК. Абутковая фабрыка імя Гіршы Лекерта выканала прамфінплян за сакавік на 103 проц. Паказальнікі па якасьці прадукцыі значна горшыя. Замест вырабу 90 проц. прадукцыі першага гатунку фактычна вырабляецца 83 проц.

Барацьба за паляпшэньне яшчэ не стаіць у цэнтры ўвагі партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі фабрыкі. Рад цэхкомаў і партячэек бязьдзейнічаюць у гэтым. Вытворчы сэктар вінтавога цэху, якім кіруе тав. Бэрлін, ні разу ня зьбіраўся, а ў гэтым цэху якасьць выпусканай прадукцыі яўна нездавальняючая (замест 90 проц. першага гатунку вырабляецца 80,4 проц.)

Бездушныя і нашбайныя адносіны да работы з боку некаторых адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў вядуць да павялічэньня браку прадукцыі.

У вінтавым цэху майстар першай зьмены тав. Віліш, дабіваючыся павялічэньня колькасьці вырабаў, загадаў здымаць з калодкі слаба высушаны абутак. У выніку атрымліваецца мяккі пасок і абсад, крывы абутак. Такі мэтад выкарыстоўвае і другая зьмена.

Адзел забесьпячэньня фабрыкі часта дае недаброякасны поўфабрыкат. Ранты вырабляюцца ня з тонкага паўвалу, а з дрэннай сьвіной скуры.

Кантрольны аддзел не зьяўляецца актыўным змагаром за якасьць. Бракеры ня ўжываюць мер да тых, хто робіць брак, а гэтым патураюць нядбайнасьці і бездапякасьці. Няма ўліку якасьці выробленай кожным рабочым прадукцыі, што аблягчае вінаватых у браку. У студзені фабрычныя арганізацыі паставілі перайсьці на жэтоны ўлік якасьці, але ён дагэтуль не ажыцьцяўляецца.

Віцебская гарбарня за апошні час пачала спабжаць фабрыку недаброякаснымі далапожнымі часткамі: абсацы амаль заўсёды крывыя, сьцелькі пягодныя.

На фабрыцы ёсьць паасобныя зьмены і цэхі, якія паказваюць узоры барацьбы за якасьць. Рантавы цэх, замест прадугледжаных плянам 87 проц. вырабу прадукцыі першага гатунку дае 88-91,4 проц. Зьмена Даўгалава перавыконвае якасныя паказальнікі на 5-6 проц., але вопыт іх барацьбы за якасьць не перакосіцца ў іншыя зьмены.

Зігельбаўм — загадчык цэху хлапчуковага паліто ф-ніи «Прафінтэрн», брак у яго цэху даведзены з 6-ці проц. да 1,3 проц. Пераробкі амаль канчаткова зьнішчаны

На фабрыцы ня ўжываецца актыўным змаганьнем за якасьць. Бракеры ня ўжываюць мер да тых, хто робіць брак, а гэтым патурацоць нядбайнасьці і бездапякасьці. Няма ўліку якасьці выробленай кожным рабочым прадукцыі, што аблягчае вінаватых у браку. У студзені фабрычныя арганізацыі паставілі перайсьці на жэтоны ўлік якасьці, але ён дагэтуль не ажыцьцяўляецца.

Віцебская гарбарня за апошні час пачала спабжаць фабрыку недаброякаснымі далапожнымі часткамі: абсацы амаль заўсёды крывыя, сьцелькі пягодныя.

На фабрыцы ёсьць паасобныя зьмены і цэхі, якія паказваюць узоры барацьбы за якасьць. Рантавы цэх, замест прадугледжаных плянам 87 проц. вырабу прадукцыі першага гатунку дае 88-91,4 проц. Зьмена Даўгалава перавыконвае якасныя паказальнікі на 5-6 проц., але вопыт іх барацьбы за якасьць не перакосіцца ў іншыя зьмены.

Брыгада «Зьвязды» — **Магергут, Авербух, Ільненка, Зарубежны.**

Не ігнараваць запатрабаваньняў спажыўца

ГОМЕЛЬ. Барацьба за ўзьняцьце якасьці выпушчанай прадукцыі, за вынікаючае сабекошту па радзе Гомельскіх прадпрыемстваў вядзецца невыстарчальна. На Гомсельмашы процант браку на ліцьці ў студзені 1932 году узьнімуся да 9,2 проц. замест 8 па плане. Ліцейны цэх заводу імя Ленінцукага ў студзені даў браку па ліцьці 20,7 проц., а ў лютым гэты процант узрос да 21,8.

Абутковая фабрыка «Праца» з прычыны дрэннай якасьці прадукцыі мела страт у студзені па 5.991 руб., а ў лютым на 2.544 руб.

Зараз праведзена спэцыялізацыя зьмен, якая крыху палепшыла якасьць выпрацоўкі. Плян выпуску абутку першага гатунку ў студзені быў выкананы на 76 проц., а ў лютым па 89 проц.

Асабліва нізкую якасьць прадукцыі дае гомельскі цукеркавы камбінат «Спартак». 31 студзеня 1932 г. Наркамснаб РСФСР, у парадку арбітражу, пастанавіў спагнаць у карысьць Варонескага вузлавога ТСТ з Гомельскага камбінату «Спартак», за дастаўку дрэннай прадукцыі больш 20.000 руб.

Адна з прычын, якая павялічвае процант браку — гэта парушэньне стандарту. На фабрыках «Праца», «Камінтэрн», «Вазуві», панчошнай і іншых стандарты ігнаруюцца. На швэйнай фабрыцы «Камінтэрн» да апошняга часу не зварачалі ніякай увагі на размер вопраткі: шылі адпалкава і на высокага і на ніжэйшага

Тэхнічны кантроль у цэхах зусім слаты. Кухараў было 6, а цяпер—4, афіцыянтак—8, а цяпер—5. Вось лепшыя з іх прэміяваныя ўдарнікі: **Карпей Стэфа, Жыгалка М., Шукевіч М.** і кухар **Гарбач Рыгор.**

Добра працуе бракеражная камісія. У яе рабоце прымае актыўны ўдзел санітарны доктар. Якасьць абедаў кожны дзень адзначаецца ў заведзенай для гэтага кнізе.

Прадуктамі сталоўка забясьпечваецца з прыгараднай гаспадаркі ТСТ і шляхам самазагатовак. За апошні квартал плян самазагатовак выкананы на 200 проц. Такім чынам, кіраўніцтва дабілася стварэньня двухмесячнага запасу важнейшых прадуктаў.

Ёсьць у сталоўцы і недахопы. Не прыстасаваны памяшканьні для хаваньня прадуктаў, не заўсёды захоўваюцца санітарныя ўмовы. Супамыйня знаходзіцца побач з месцам падрыхтоўкі прадуктаў для катла, тут-жа знаходзіцца бульбачыстка, хлебарэзка і мясарубка.

Сталоўка павінна дабіцца ўзорнага парадку і на кухні. Неабходна лепш абсталяваць кладоўку, бо ў існуючай зараз нельга трымаць прадукты. Калектыў работнікаў сталоўкі № 3 дабіўся першых і даволі важных посьпехаў у перабудове работы. Яго прыклад паказвае, што трудпасьці ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня можна з посьпехам перамагчы. Загадчык гэтай сталоўкі—рабочы-вылучэнец **Мзерсон М.** Яго ініцыятыўнасьць, уменьне арганізаваць работу, правільна расставіць сілы зьяўляцца прыкладам таго, як троба кіраваць па-новаму.

Брыгада:

Краўчанка, Дашкевіч, Андросін, Яцына, Гаворна.

Адзін мясцком ківає на другога

У сталоўцы ТСТ № 2 харчуецца некалькі службаў: дэпо, паравозныя брыгады, службы цягі і эксплёатацыі.

Гэта сталоўка гатуе 2.000 страў у суткі. Уведзена паблюдная сыстэма. На першае бывае выбар з 2-3, а на другое — з 3-4 страў. Гэта значна палепшыла абслугоўваньне рабочых, але якасьць абедаў ніякая. Калі брыгада правярала работу сталоўкі, абеды гатаваліся з мёрзлай бульбы, боршч быў сыры, а другое паогул рэдка бывае патрэбнай вагі: біткі павінны мець 100 грам, але, калі зважылі біткі, то аказалася ў ім толькі 60 грам.

Сталоўка № 2 працуе круглыя суткі, бо яна павінна забясьпечваць паравозныя брыгады і ночу сьвежымі добраякаснымі абедамі. З гэтай залачай сталоўка не спраўляецца. Часта бывае, што замест сьвежых абедаў паравозьнікі атрымліваюць астачу дзённых. Ніхто ня сочыць за якасьцю харчаваньня, няма бракеражнай камісіі.

Кожны мясцком службаў лічыць гэту сталоўку не сваёй. Адзін мясцком ківає на другога і ўсе разам вічога ня робяць для паляпшэньні харчаваньня. Найбольш абураючым зьяўляецца тое, што і кіраўніцтва партарганізацыі і, у прыватнасьці, дэпо прытрымліваюцца такой-жа самай тактыкі адмаханьня. Ня дзіва пасьля гэтага, чаму ў сталоўцы злачынна разбазарваюцца, раскрадваюцца прадукты. Камісія ЦКК, якая праводзіць агляд работы, выявіла шмат падобнага роду абураючых фактаў.

Самазагатоўкі не разгорнуты. Кіраўніцтва «праяўляе ініцыятыву» праз закупку мяса па прыватным рынку па высокай цане. Ня цяжка зразумець, чаго варта такое праяўленьне «ініцыятывы».

Буфэт, што існуе пры сталоўцы, павінен забясьпечваць паравозьнікаў мясными і малочнымі сухімі прадуктамі. Інвэнтарыз кіраўніцтва асабліва моцна адбіваецца на яго рабоце. Апрача хлеба і цукру ў буфэце няма нічога.

Антысанітарыя, бруд лічацца «нармальнай» зьявай у сталоўцы. Начыньне мяцца ў вадзе з нявысокай тэмпэратурай і не выпіраецца. Гатаванай вады няма, абедаючыя вымушаны піць сырую. Гэта ў той час, калі ў сталоўцы ёсьць цітэнка, якую, да рэчы кажучы, ніяк ня могуць устанавіць.

Работу сталоўкі № 2 патрэбна карэнным чынам перабудаваць. Перш за ўсё трэба ўзяцца за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, зьдзельнічыны, за разгортваньне самазагатовак. Трэба зламаць коснасьць кіраўніцтва, абнавіць яго. Новае кіраўніцтва справіцца з работай пры ўмове, калі парт'ячэйкі і мясцкомы, якіх налічваецца 4, ня будуць лічыць сталоўку «ня нашай», а возьмуцца як сьлед за паладжаньне грамадзкага харчаваньня.

Брыгада:

ЯНКОЎСКІ, Л., ГОЛУБ А., МАНЬКОЎ, А., ВАРАНКОЎ, ГРЫШАЛЕВІЧ.

Раўняцца па брыгадах Шумянцэра і Файнштэйна

ВІЦЕБСК. Швэйная фабрыка «Прафінтэрн» прамфінплян за сакавік выканала на 100,8 проц., але якасныя паказальнікі яе нездавальняючыя. Брак у студзені і лютым дасягнуў 2,25 проц. замест меркаванага планам аднаго процанту. За два месяцы было зроблена 2.573 пераробкі, за што выплачана 2.600 руб. Крыўдзе браку за першыя два тыдні сакавіка ўзрасла да 3,2 проц. Найгоршую прадукцыю дае цэх вырабу гумовых польтаў, дзе брак дасягнуў 14,2 проц. Прычына гэтага — адсутнасьць тэхнічкі, вельмі слабая барацьба за якасьць.

Цэх вырабу польтаў за два тыдні (другой паловы сакавіка) меў 665 пераробак.

Кантрольны аддзел фабрыкі працуе вельмі дрэнна. Нядбайныя, бездапякасныя адносіны да сваіх абавязкаў з боку паасобных кантралёраў зрываюць работу ўдарных брыгад. Першая гаспадарча-разрахункова брыгада цэху жаночых польтаў, якая свае вытворчыя заданьні перавыконвала на 8-10 проц., за апошнія 5 дзён мае перабоі ў рабоце толькі таму, што кантралёр складу тав. ЖЫТЭЛЬЗЭЙФ прапусьціў у цэх неадпаведны раскрой.

Узоры барацьбы за якасьць паказваю ЦЭХ ХЛАПЧУКОВЫХ ПОЛЬТАЎ. Брак у гэтым цэху зьніжаны да 1,3 проц. Прамфінплян сыстэматычна перавыконваецца. Перадавікамі ідуць ударныя брыгады ШУМЯНЦЭРА і ФАЙНШТЭЙНА, якія стварылі кантрольныя пасты якасьці, высунулі сустрэчныя пляны і дабіліся зьнішчэньня браку і пераробак. Дрэнна тое, што ўзорныя прыклады работы гэтых брыгад не папулярызаваны ва ўсіх цэхах фабрыкі.

Зараз парт. і прафарганізацыі «Прафінтэрну» абвясьцілі штурм недахопаў у выкананьні якасных паказальнікаў. У цэхах, брыгадах праводзяцца вытворчыя нарады. Створана вітрына, дзе паказаны канкрэтныя вінаватыя у браку і пераробках.

Брыгада «Зьвязды»:

ІГОЛЬНІКАЎ, ФЛЯМЕНБАУМ, УЗЬДЗІН, ЗАРУБЕЖНЫ.

Валадарцы ідуць у калёне перадавікоў

Магілёўская швэйная фабрыка імя Валадарскага па-баявому падрыхтавалася да ўсебеларускай канфэрэнцыі ўдарнікаў якасьці. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі правялі шырокую масавую работу ў цэхах, зьменах і агрэгатах. Падрыхтоўка ішла пад лёзунгам завалаць права рапартаваць канфэрэнцыі. Кампанія перазаключэньня калдагаворэў была шырока выкарыстана для жвавізацыі рабочых на барацьбу з бракам і паляпшэньне якасьці прадукцыі. Агульна-фабрычная канфэрэнцыя ўдарнікаў якасьці, якая адбывалася ў лютым, узварушыла рабочую грамадзкасьць.

У выніку шырокай культмасавай работы рад зьмен, якія нагатуль адставалі ў выкананьні прамфінпляну, зьяўляліся кандыдатамі на атрыманьне рагожнага сьцягу (зьмена майстра Лесапнёва і Мар'яськіна), дзякуючы правільнай расстаноўцы сіл, напружанай барацьбе за якасьць, за ліквідацыю застаўваньня, заваявалі пераходны сьцяг.

Плян першага кварталу выканан фабрыкай на 99,4 проц. Процант браку зьнижан да 1,38 проц. замест 1,5 паводле пляну.

Фабрыка імя Валадарскага сваёй работай дабілася права на мандат на ўсебеларускай канфэрэнцыі якасьці.

Я. Рохлін.

Па сталоўках менскага вузла—РЭЙД брыгад „Зьвязды" і „Чырвонага чыгуначніка"

Паравозным брыгадам, рабочым чыгункі—добраякасны абед

ВОПЫТ СТАЛОЎКІ N 3 ПЕРАНЕСЬЦІ У ПРАКТЫКУ АРГАНІЗАЦЫІ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ НА УСІМ ВУЗЬЛЕ

Першыя посьпехі сапраўднай перабудовы

Чыстая сьветлая заля. Столікі накрыты белым цыратом. Чаргі няма. Абеды падаюцца хутка. Есьць выбар. Напрыклад, сёньня на першае шчы кіслыя, суп шпонны, суп рысавы, на другое—смажанае парася, рулет і гуляш і на цэляе—кампот і кава. Абед з трох страў і па калёрыйнасьці вышэй, чым у іншых чыгуначных сталоўках.

На вядным месцы вісіць дошка і на ёй прозьвішчы ўсіх работнікаў сталоўкі са штодзённай адзнакай аб адносінах да працы.

Так выглядае сталоўка менскага ТСТ № 3, дзе харчуюцца звыш 600 фабзавучнікаў і ПТР.

Сталоўка № 3 дабілася ўзорнасьці ў выніку бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю пастаноў партыі і ўраду аб грамадзкім харчаваньні і 6 пятгадовых умоў тав. **Сталіна.**

З 1 кастрычніка мінулага году сталоўка ўвяла паблюдную сыстэму і перайшла на зьдзельшчыну. Гэта дало вялікі зрух у паляпшэньні абслугоўваньня работы і прывяло да скарачэньня штату з 37 да 24 адзінак. Зьдзельная аплата ліквідавала існаваўшую раней урэгуляваную ў зарплаце. Сацспаборніцтва кухараў, афіцыянтак і суднамыек, якое арганізавана чэтыйнай4 ячэйкай МШВ, значна ўзьняло прадукцыйнасьць і якасьць работы. Штодзённая адзнака на дошцы сацспаборніцтва робіцца з уліку усіх паказальнікаў работы.

Вынікі відавочны. Значна ўзьнялася прадукцыйнасьць працы, палепшылася якасьць. Даволі сказаць, што да пераходу на зьдзельшчыну ў суднамыйні было 10 чалавек і з работай не спраўляліся. Пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны засталіся два чалавекі, якія добра спраўляюцца з работай. Кухараў было 6, а цяпер—4, афіцыянтак—8, а цяпер—5. Вось лепшыя з іх прэміяваныя ўдарнікі: **Карпей Стэфа, Жыгалка М., Шукевіч М.** і кухар **Гарбач Рыгор.**

Добра працуе бракеражная камісія. У яе рабоце прымае актыўны ўдзел санітарны доктар. Якасьць абедаў кожны дзень адзначаецца ў заведзенай для гэтага кнізе.

Прадуктамі сталоўка забясьпечваецца з прыгараднай гаспадаркі ТСТ і шляхам самазагатовак. За апошні квартал плян самазагатовак выкананы на 200 проц. Такім чынам, кіраўніцтва дабілася стварэньня двухмесячнага запасу важнейшых прадуктаў.

Ёсьць у сталоўцы і недахопы. Не прыстасаваны памяшканьні для хаваньня прадуктаў, не заўсёды захоўваюцца санітарныя ўмовы. Супамыйня знаходзіцца побач з месцам падрыхтоўкі прадуктаў для катла, тут-жа знаходзіцца бульбачыстка, хлебарэзка і мясарубка.

Сталоўка павінна дабіцца ўзорнага парадку і на кухні. Неабходна лепш абсталяваць кладоўку, бо ў існуючай зараз нельга трымаць прадукты. Калектыў работнікаў сталоўкі № 3 дабіўся першых і даволі важных посьпехаў у перабудове работы. Яго прыклад паказвае, што трудпасьці ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня можна з посьпехам перамагчы. Загадчык гэтай сталоўкі—рабочы-вылучэнец **Мзерсон М.** Яго ініцыятыўнасьць, уменьне арганізаваць работу, правільна расставіць сілы зьяўляцца прыкладам таго, як троба кіраваць па-новаму.

Брыгада:

Краўчанка, Дашкевіч, Андросін, Яцына, Гаворна.

АБ ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ ГРУПЫ СТАЛОВАК ГОР. МЕНСКУ

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і Калегіі НК РСІ Бел ад 29-III 1932 году

Адзначыць, што, ня глядзячы на неадпаразовыя ўказаньні інспэктараў ЦКК-НК РСІ па грамадзкім харчаваньні і пастановы ЦКК - РСІ, пры паўторнай праверцы выявілася, что ў рабоце сталовак і трэсту «Менкаапхарч» пералому яшчэ няма.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ Беларусі пастанаўляюць:

1. Намесьніка дырэктара трэсту Менкаапхарч тав. **Велікасельца** за невыкананьне прапаноў ЦКК - НК РСІ і непрыняцьце актыўных мер па паляпшэньні работы сталовых, з працы зьняць.

2. Загатчыку студэнцкай сталовай № 69 **Мерзнштэйну** за дрэнную якасьць харчаваньня, за бескаспадарчасьць у сталовай — абвясьціць вымову, а справу аб нам. загатчыка сталоўкі № 69 т. т. Шварца і Удзіна — перадаць на выраішэньне ў 5-дзённы тэрмін у Мен. гар. КК.

3. Даручыць трэсту Менкаапхарч сумесна з парткалектывам пачотчай фабрыкі — абгаварыць магчымасьць палепшэньня працы пам. заг. сталовак тав. **Гутман.**

4. Даручыць інспэкцыі цэн аштрафаваць асоб, вінаватых у павышэньні цэн па студэнцкай сталовай пры Чырвоным крыжы. Прапанаваць чырвонаму крыжу перадаць студэнцкую сталовую ў веданьне Менкаапхарчу.

5. Паставіць пытаньне перад ЦСПСБ аб арганізацыі клюбу для работнікаў грамадзкага харчаваньня.

6. Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ БССР ня раз валакнуць работнікам грамадзкага харчаваньня аб неабходнасьці з іх боку самы энэргічных мер па паляпшэньні працы сталовых, асабліва па паляпшэньні якасьці страў, увядзеньні паблюднай сыстэмы, ліквідацыі антысанітарыі, разгортваньні самазагатовак. ЦКК-РСІ патрабуе ад фабрычных, паўтыйных і прафэсыянальных арганізацый устанаўленьня сыстэматычнага рабочага кантролю і аказаньня дапамогі сталовым.

7. Пастанову абвясьціць у друку.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б
нам. наркома РСІ Бел. ТУРЛА

Прафкомы і гаспадарнікі не дапамагаюць сталоўцы

Работа сталоўкі ТСТ № 4 за апошні час значна палепшылася. Няма ранейшага бруду на кухні і ў залі. Палепшана якасьць абедаў, уведзена паблюдная сыстэма.

У забесьпячэньні прадуктамі харчаваньня няма перабояў. Выраішэньне гэтай задачы ідзе ў двух кірунках.

Паміж работнікамі кухні і работнікамі абедзенай залі разгорнута сацспаборніцтва. Лепшыя ўдарніцы суднамойкі **Клімовіч** і **Плашчынская** прэміяваны.

Харчуецца ў сталоўцы № 4 некалькі службаў: рабочыя малога рамонту вагонаў, службы шляху, службы нагляднікаў будынкаў і 5-ты буфэтчы вучастак. Тры прафкомы замест дапамагаць сталоўцы. Спадзяючыся адзін на другога, усе тры ня цікавяцца сталоўкай.

Дах у будынку сталоўкі даўно ўпяцяе, у некаторых месцах столь рамокла і кожную хвіліну можа абваліцца. Жыхт № 19 даху не рамонтуе, а кіраўнікі службаў і прафкомаў адмаўляюцца аказаць сталоўцы дапамогу.

Брыгада:

Паўль Эд., Паўлаў, Кананосі Калодка, Нямірові́ч А., Самсейка.

800.000 КБМ. ДРАЎНІНЫ ЯШЧЭ НЯ ВЫВЕЗЕНЫ З ЛЕСУ

Паводле даных Лесбелу па 1 красавіка квартальны плян загатовак дзелавой драўніны па БССР выкананы на 132,8 проц., па загатоўках дроў—на 104 проц. Заданьне на вывазкі лесаматар'ялу выкананае на 91,4 проц., дроў—на 87 проц.

Такім чынам, праграма лесазагатовак у 4.709 тыс. кубаметраў выкананa з перавышэньнем. Плян-жа лесавывазкі значна недавыкананы. З патрэбных 7.063 тыс. кбм. вывезена толькі 6.255 тыс. кбм. Больш 800 тыс. кбм. застаецца ў лесе.

Значная частка лесграмгасаў (Ельскі, Шклоўскі, Чачэрскі, Чэрыкаўскі, Сенненскі, Парыцкі, Плешчаніцкі, Нараўлянскі, Касьцюковіцкі, Віцебскі і Бешанковіцкі) слае заданьні па лесавывазцы выканалі ад 30 да 75 проц. Гэта тлумачыцца тым, што арганізацыі гэтых раёнаў ня здолелі па-бальшавіцку ажыцьцявіць дырэктывы партыі і ўраду аб максымальным фарсаваньні лесавывазкі ў лютым і сакавіку ў сувязі з добрай сонцай дарогай, не разгарнулі вакол лесазагатоўчай кампаніі шырокай масавай работы сярод калгасных і бядняцка-сярэднацкіх мас, не мабілізавалі іх на барацьбу з кулацкім сабатажам і кулацкімі тэндэнцыямі боку праўдашукаў паасобных калгаса накіраванымі па зрыў лесавывазкі.

Побач з гэтым троба адзначыць што рад раёнаў, якія ў студзені зазнаходзіліся ў глыбокім тыле лесасьпякі, за люты і сакавік здолелі выйсьці ў перадавую калёну барацьбітоў лесного фронту. Даволі паказаць на адзін з буйных лесграмгасаў БССР—Рэчыцкі, які на 1 лютага вывез дроў і лесу толькі 15,8 проц. заданьня. На 25 сакавіка ён ужо рапартаваў аб дасягненьні новым выкананьні пляну лесавывазкі. Такіх-жа посьпехаў дабіліся Бярэзінскі, Ветка́ўскі, Заслаўскі, Камарынскі, Чырвона-Слабодзкі, Лагойскі, Рагачоўскі, Тураўскі, Чэрвеньскі, Сураскі, Бярэзінскі і Смалявіцкі лесграмгасы. Усяго поўнасьцю выканалі свае заданьні 14 лесграмгасаў. Каля 1 наблізіліся да поўнага выкананьня.

Квартал скончыўся, але гэта ня значыць, што вывазка лесу павінна быць спынена. Дні, якія засталіся да разгортваньня пасеўнай кампаніі, павінны быць максымальна скарыстаны для пазрыцьця запазычанасьці мінулага кварталу.

А. БРАУДЭ

Машынабудаўніцтва ў 1932 годзе

Плян народна-гаспадарчага і культурнага будаўніцтва на 1928-29—1932-33 г.г. (першы пяцігадовы плян) намячаў павялічэньне прадукцыі машынабудаўніцтва (уключаючы электратэхнічную прамысловасьць і вытворчасьць розных мэталёвых вырабаў) з 1.242 млн. руб. у 1927-28 годзе да 4.351 млн. руб. у 1932-33 годзе, г. зн. у 3,5 раза.

Шырока разгарнуўшы сацыялістычнае саборніцтва і ўдарніцтва, машынабудаўнікі СССР, пад кіраўніцтвам УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК, ужо ў трэцім годзе пяцігодкі перавыканалі гэта заданьне, даўшы ў 1931 годзе прадукцыі на 4.700 млн. руб.[1]).

Укладаючы ў асноўныя фонды машынабудаўніцтва за першыя тры гады пяцігодкі перавысілі прыкладна ў два разы намячэньні пяцігадовага пляну.

Калі ад гэтых агульных лічбаў перайсьці да паасобных вытворчасьцяў, дык мы можам ілюстраваць нашы посьпехі такімі лічбамі.

Выраб паравозаў (для НКШЗ) намячаўся пяцігодкай на 1932-33 год у 825 штук, таварных вагонаў—у 12,6 тыс. штук, выраблена ўжо ў 1931 годзе 813 паравозаў і 19 тысяч вагонаў.

Выраб трактараў (у пераліччэньні на 10-сілавы тып «фордзон-путылавец») пяцігодкай намячаўся ў 1931-1932 годзе ў 20 тыс. штук і ў 1932-33 годзе ў 55 тыс. штук. У 1931 годзе выраблена 20 тыс. «путылаўцаў» і 20 тысяч 15-сілавых «інтэрнацыяналаў» (Сталінградскага і ў чацьвертым квартале Харкаўскага заводу), а ўсяго па гэтых двох тыпах трактараў—40 тыс. трактараў магутнасьцю ў 500 тыс. конскіх сіл, або 50 тыс. трактараў у пераліччэньні на 10-сілавы.

У 1931 г. заводы с.-г. машынабудаўніцтва далі прадукцыі прыкладна ў разьмерах, якія адпавядаюць узроўню чацьвертага году пяцігодкі па пяцігадовым плане, прычым ёсьць вялізарныя дасягненьні ў паасобных відах выпрацаванай прадукцыі—палат выраб камбайнаў, асвоена вытворчасьць складанага прычэпнага інвэнтару да трактараў і г. д.

Але пры ўсіх гэтых вялізарных посьпехах і перавыкананьні агульных заданьняў пяцігодкі 1931 г. даў недавыкананьне колькасных і якасных паказальнікаў гадавога пляну.

Прычыны недавыкананьня пляну прамысловасьці ў цэлым, адзначаныя ў пастанове XVII партканфэрэнцыі па дакладу т. Арджанікідзэ, поўнасьцю адносяцца і да машынабудаўніцтва. Правазапартуністычныя спробы асобных работнікаў зьвесьці ўсе прычыны да недастачнасьці матэрыялаў павінны быць рашуча адхілены ўжо хаця-б па адным тым, што на радзе заводаў, якія былі ў лепшых умовах па спабжэньні матэрыялам, праграма выконвалася горш, чым на іншых заводах. Арганізацыі заводаў машынабудаўніцтва не мабілізаваліся, каб перакрыць меўшае месца недастачнасьць матэрыялам (з-за недавыкананьня праграмы чорнай мэталургіяй) мабілізацыяй унутраных мэталічных рэсурсаў і барацьбой за эканомію мэталу (шляхам увядзеньня новых канструкцый, памяншэньня прыпускоў, прыстасаваньня зварні і г. д.), хоць многія заводы ў гэтых адносінах мелі вялікія посьпехі.

Недахопы ў арганізацыі працы і ў сыстэме заработнай платы, дрэнная пастаноўка ўнутрызаводзкага плянаваньня, незьстарчальная канкурэнцыя кіраўніцтва, невыстарчальнае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку і іншыя хібы ў рабоце машынабудаўнічых заводаў і аб'яднаньняў павінны быць зжыты ў найкарацейшы тэрмін.

Народна-гаспадарчы плян на 1932 год дае машынабудаўніцтву цэлы рад баявых ударных заданьняў.

Агульныя разьмеры вытворчасьці ўстаноўлены, згодна рэзалюцыі 17-ай партканфэрэнцыі, у 6.800 млн. руб.

Сацыялістычнае машынабудаўніцтва павінна ў 1932 г. у першую чаргу даць неабходнае абсталяваньне для рашаючых зьвеньняў сацыялістычнай гаспадаркі—чорнай мэталургіі, вугалю, цэмэнту. Машынабудаўнікі павінны даць домэннае і мартэнаўскае абсталяваньне, блюмінгі, пракатныя станы, магутныя кранты і г. д., каб забясьпечыць пуск новых домнаў, мартэнаў і пракатных цэхаў. Забясьпечыць машынамі ўсе зьвеньні нашай сацыялістычнай гаспадаркі—газі лёзунг, вакол якога павінна быць мабілізавана маса рабочых.

Знабыча вугалю павінна павялічыцца ў 1932 г. у 1,5 раза. Заданьне машынабудаўніцтву—даць для мэханізацыі вугледабычы 900 урубавых машын, даць пад'ёмнае абсталяваньне, вагонткі і г. д.

Транспарт не павінен быць «вузкім месцам» для народнай гаспадаркі СССР. Задача транспартнага машынабудаўніцтва—выпусьціць у 1932 г. 1.300 паравозаў і 50 тыс. таварных вагонаў (у двухосным вылічэньні), магутныя паравозы, мотавозы, цепловозы, магістральныя электравозы, каталы высокага ціску, ковачныя машыны, магутныя гідраўлічныя прэсы, драгі, экскаватары, кіслотатрывалая і хэмічная апаратура, хэмічная апаратура для вялікіх ціскаў і высокіх тэмпэратур і г. д.).

Асваеньнем новых вытворчасьцяў мы забясьпечым заваяваньне тэхніка-эканамічнай незалежнасьці Савецкага Саюзу.

Аўладаньне новай тэхнікай павінна ісьці ня толькі па лініі арганізацыі вырабу абсталяваньня, якое раней у СССР не выдаблялася, але і па лініі асваеньня новых, найбольш удасканаленых мэтадаў вытворчасьці.

Трэба пашырыць ужываньне газавай і электрычнай зварки (замест клёпкі). Зварка дае эканомію мэталу, зьмяншае затраты працы, паскарае працэс вытворчасьці. Выраб апаратуры для газавай зваркі ўжо разгорнут на ленінградзкім заводзе імя Мацьвеева і на пова-пабудаваным заводзе ў Маскве, што дае магчымасьць поўнасьцю спыніць увоз гэтай апаратуры з-за мяжы. Разгортваецца ў 1932 г. і выраб апаратуры для электразваркі.

У найбольшай меры павінны быць скарыстаны магчымасьці сацыялізацыі і каапэраваньня існуючых заводаў, якія дазваляюць значна павялічыць іх вытворчую здольнасьць і якія падрыхтоўваюць далейшае разгортваньне сацыялістычнага і каапэраваньня сацыялістычнага машынабудаўніцтва ў другім пяцігодзьдзі.

Разьвіцьцё вытворчасьці ў 1932 г. на ўмовах удасканаленьня тэхнікі стварае ўсе неабходныя прадпасылкі для барацьбы за якасныя паказальнікі машынабудаўніцтва, у першую чаргу за павышэньне прадукцыйнасьці працы, зьнижэньне сабекошту, павышэньне якасьці прадукцыі.

На аснове ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна машынабудаўнікі павінны забясьпечыць выкананьне заданьня па павышэньні прадукцыйнасьці працы, якое зьяўляецца абавязковай умовай выкананьня пляну зьнижэньня сабекошту, устаноўленага для машынабудаўніцтва ў разьмеры, які амаль у два разы перавышае сярэдняе заданьне па ўсёй прамысловасьці.

У сустрочных пляны прадпрыемстваў павінны быць бязумоўна распрацаваны канкрэтныя практычныя мерапрыемствы па эканоміі мэталу, у выніку якіх неабходна дабіцца, каб у межах вылучанай для машынабудаўніцтва ў цэлым і для кожнага заводу ў паасобку колькасьці мэталу выпусьціць больш машын і абсталяваньня. «Трэба дабіцца таго, каб цяжкая прамысловасьць і перш за ўсё яе машынабудаўнічая частка талсама давала накапленьні» (Сталін).

Вялізарнай вытворчай праграме машынабудаўніцтва адпавядае і вялізарная будаўнічая праграма. Агульны разьмер укладаньняў у машынабудаўніцтва, устаноўлены ў 1.870 млн. руб., амаль у тры разы (правільней у 2,8 раза) больш намечаных на 1932-33 г. пяцігадовым пляном; з іх у машынабудаўніцтва для мэталургічнай, горнай і вугольнай прамысловасьці—267 млн. руб., паравоза-вагона-будаўніцтва—239 млн., аўтагрэйтарабудаўніцтва—300 млн. руб., электра-тэхнічную прамысловасьць—287 млн. руб.

У 1932 г. павінны быць пабудаваны такія гіганты, як Краматорскі і Уральскі заводы цяжкага машынабудаўніцтва. Яны павінны даць 270 тысяч пудоў прадукцыі. Гэтыя два гіганты дадуць магчымасьць праз адзін год толькі па адной чорнай мэталургіі штогодна забясьпечваць абсталяваньнем 2 такія заводы, як Магнітагорскі. В сваёй магутнасьці і тэхнічным абсталяваньні яны ня маюць сабе раўных у сьвеце. У гэтай галіне СССР ня толькі дагоняе, але і перагоняе ў тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

У першым паўгодзьдзі навінен быць пушчан Харкаўскі турбінны завод. В 1932 г. канчаецца будаўніцтва Чялябінскага трактарнага і Луганскага паравоза-будаўнічага заводаў. Разгортваецца будаўніцтва Нізжнетагільскага вагоннага заводу. Будзе прыступлена да будаўніцтва вялікага кацельнага заводу ва Ўфе і г. д.

Прыклад Ікорскага заводу, які пабудаваў у 1931 г. два блюмінгі, Рыбінскага мэталургічнага заводу, які вырабіў першыя разьлічаныя машыны з савецкіх матар'ялаў, заводу Электрасіла, што выпусьціў магутныя турбіны, гаворыць аб тым, што пляны заводы здольны будаваць самыя складаныя і дакладныя машыны.

Машынабудаўніцтва ў капіталістычных краінах пад учарэшнім крызісам згортваецца з кожным днём. (Узровень машынабудаўніцтва ў ПАША 1931 г. зьнізіўся больш чым на трэці у параўнаньні з 1929 г., у Германіі больш чым на дзве пятых).

Машынабудаўніцтва ў Савецкім Саюзе магутна разгортваецца, пачынаючы прадукцыю з 2.100 млн. руб. у 1929 г. да 4.700 млн. руб. у 1931 годзе і ўжо ўна сабе бачнае заданьне—даць у 1932 г. прадукцыі на 6.800 млн. руб.

[1]) У адпаведных цэнах 1926-27 году.

АКУПАНТЫ ЗАМАЦОЎВАЮЦЦА Ў ШАНХАІ

Аб вывадзе японскіх войск... І ня думаюць

Японская дэлегацыя дамагаецца выводу кітайскіх войск з Путуну і Наньдао

ШАНХАЙ, 8. На ўчарайшным пасяджэньні канфэрэнцыі японская дэлегацыя дамагалася выводу кітайскіх войск з Путуну і Наньдао, матывуючы патрабаваньне тым, што кітайскія войскі, якія знаходзяцца ў гэтых раёнах, пібыта пагражаюць японскаму тылу. Кітайская дэлегацыя адмовілася разглядаць патрабаваньне, але па дамаганьні «нейтральных дэлегацый» канфэрэнцыі гэта пытаньне перадана на разгляд ваеннай падкамісіі, на што кітайская дэлегацыя згодзілася. Гарачыя спрэчкі разгарнуліся па пытаньні аб апошнім тэрміне выводу японскіх войск у межы сэтльмэнту. Кітайская дэлегацыя ўказвала на няпрыемлемасьць меркаванай дэкларацыі японцаў, у якой будзе выказана надзея, што вывад японскіх войск будзе праведзен, але ня будзе ўказан тэрмін гэтага выводу. **Японская дэлегацыя катэгарычна адмовілася ўстанавіць тэрмін**, заяўляючы, што японцы не на мераны больш рабіць ніякіх уступак. **Поўны правал канфэрэнцыі прадухілен ангельскім пасланьнікам Лэмпсонам**, які ўнёс наступныя прапановы:

1. Японская дэлегацыя ў дэкларацыі выказвае надзею, што поўны вывад японскіх войск будзе праведзен на працягу 6 месяцаў, а магчыма і раней, калі палепшацца ўмовы і створыцца ўпэўненасьць у бясьпечнасьці японскіх грамадзян; 2) абодва бакі выпускаюць супольную дэкларацыю, у якой японцы выказваюць надзею, што поўны вывад войск стане магчымым, а кітайцы ў сваю чаргу заяўляюць, што розалюцыі Лігі нацый ня можа лічыцца выкананай да поўнага выводу японскіх войск; 3) кітайская дэлегацыя самастойна выпускае дэкларацыю, у якой указваецца, што Кітай лічыць, што розалюцыя Лігі нацый ня лічыцца выкананай да таго часу, пакуль японскія войскі ня вывезены ў межы сэтльмэнту. Прапановы Лэмпсона перададзены ў Токіё і Нанкін дэлегатамі для атрыманьня далейшых інструкцый. Пасяджэньні канфэрэнцыі адкладзены да 9 красавіка.

Згодна паведамленьня «Чайна прэс», кітайская дэлегацыя прапанавала, каб абодва бакі, а таксама і прадстаўнікі дзяржаў, выказалі сваю думку аб тэрміне выводу войск спэцыяльнай камісіі Лігі нацый, якая дасьць сваё тлумачэньне гэтага пытаньня. Японцы не прынялі прапановы, указваючы, што камісія Лігі нацый, ня ведаючы мясцовых умоў, можа даць няправільнае тлумачэньне. Аднак, прадстаўнікі дзяржаў далучылися да прапановы кітайскай дэлегацыі. (ТАСС).

Пытаньне аб адводзе японскіх войск зноў адкладзена

ШАНХАЙ, 7. На пасяджэньні канфэрэнцыі, якое адбылося сёньня раніцою, абмяркоўвалася пытаньне аб становішчы кітайскіх войск у раёне Наньдао і Цутуна. **Пытаньне-ж аб тэрміне адводу японскіх войск адкладзена.** Магчыма, што гэта пытаньне будзе абмяркоўвацца на вячэрнім пасяджэньні, прычым лічаць, што японская дэлегацыя можа згадзіцца вызначыць тэрмін эвакуацыі пры ўмове згоды кітайскіх дэлегатаў вызначыць тэрмін скліканьня канфэрэнцыі «круглага стала».

Загад аб арышце „чапэйскага ўраду"

ШАНХАЙ, 7. Кітайскія ўлады аддалі загад аб арышце ўдзельнікаў «чапэйскага ўраду». У кітайскай частцы гораду раскленены абвесткі, у якіх гаворыцца, што кітайскі муніцыпалітэт і надалей ня будзе прызнаваць ніякіх дзеяньняў, прадпрынятых незаконнай арганізацыяй. У загадзе аб арышце падаюцца прозьвішчы «непажаданых элемэнтаў» і ўказваецца, што некаторыя з гэтых «элемэнтаў» жывуць і вядуць свае справы на тэрыторыі сэтльмэнту, не сустракаючы ніякай процідзейнасьці з боку паліцыі сэтльмэнту.

Амэрыканская газэта **«Івнінг пост»** у перадавым артыкуле ўказвае, што японцы адмаўляюцца мець справу з кітайцамі, якія хочуць вярнуцца ў Чапэй або ўехаць адтуль, не аказваючы апошнім ніякай абароны і дапамогі і такім чынам прымушаюць іх зварачацца да незаконнай арганізацыі, паколькі законным кітайскім уладам не дазваляецца выконваць свае функцыі ў раёне Чапэю. Гэта незаконная арганізацыя,—зазначае далей газэта,—якая падтрымліваецца японцамі, мае відавочна сілу і ўладу.

Поўмільёна японскіх сялян перасяляюцца ў Манчжурыю

ТОКІЁ, 7. Міністэрства калёніі стварае асобнае калёнізацыйнае бюро, якое займецца «вывучэньнем Манчжурскай дзяржавы». Усе газэты зазначаюць, што міністэрства калёніі супольна з міністэрствам зямляробства распрацоўвае плян эміграцыі поўмільёна сялян у Манчжурыю на працягу 10 год. Паводле слоў газэты, міністэрства ўнутраных спраў таксама рыхтуецца да перасяленьня карэйскіх рабочых у Манчжурыю.

ПА ЗАКЛІКУ КАМПАРТЫІ

па ўсёй Германіі адбыліся шматтысячныя дэманстрацыі пратэсту супроць імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР

БЭРЛІН, 8. Учора ў сувязі з антывоенным днём у Люстгартэне адбылася шматтысячная антывоенная дэманстрацыя кампартыі пад лёзунгамі: на абарону Савецкага Саюзу, за чырвонага баявога рабочага — кандыдата ў прэзыдэнты — Тэльмана і за абраньне камуністаў у Прускі ландтаг.

У ГАЛЕ таксама адбыўся мітынг пад адкрытым небам, на якім выступіў Тэльман. На працягу двох гадзін да месца мітынгу бесперапынна падыходзілі калёны рабочых. Рабочыя, якія сабраліся на мітынгу, горача віталі дэлегацыі з хэмічных заводаў Лейна і з капальняў Мансфэльда. У ЗСЭНЕ дэманстравала звыш 8 тысяч рабочых і работніц супроць імпэрыялістычнай вайны. Дэманстрацыя была разагнана паліцыяй.

У ДУІСБУРГУ (Рэйнская вобласьць), ня гледзячы на вялікі дождж, дэманстравала 10 тысяч працоўных. У Лейпцыгу на рабочых напалі нацыянал-сацыялісты. Адзін дэманстрант — член рэйхсбанэра — забіт стрэлам з рэвальвэру. Антывоенная дэманстрацыя адбылася ў ГАМБУРГСКІМ ПОРЦЕ.

***

БЭРЛІН, 7. У сувязі з антывоенным днём, ва Ўсходняй Прусіі ў КЕНІГСБЭРГУ адбыўся масавы мітынг, на якім выступіў тав. ТЭЛЬМАН. Да мітынгу адбылася дэманстрацыя з удзелам 10.000 чал. На мітынг прыбыў рад дэлегацый з вёсак. Адны чыгуначнікі прыслалі каля 400 чал. Сельска-гаспадарчыя рабочыя прыслалі дэлегацыю ў 40 чал., беднякі сяляне — 10 чал., рабочыя цэлюлёзнага заводу — 30 чал., партавікі Кенігсбэрга і Пілаву — 100 чал., трамвайшчыкі — 20 чал. і г. д. Буйнейшая заля Кенігсбэрга не магла зьмясьціць усіх жадаючых прысутнічаць на мітынгу, ня гледзячы на тое, што з залі вынесьлі ўсю мэблю, уключаючы і крэслы.

Выступаўшы на мітынгу, тав. Тэльман спынуўся галоўным чынам, на значэньні Ўсходняй Прусіі ва ўсёй замежнай палітыцы Германіі і на непасрэднай сувязі паміж рэвалюцыйнымі баямі германскага пралетарыяту супроць буржуазіі, супроць вэрсальскай сыстэмы і ў абарону Савецкага Саюзу. Савецкі ўрад, сказаў тав. Тэльман, зьяўляецца адзіным, які прынцыпова супроць ганебнага вэрсальскага дагавору.

„Рукі прэч ад савецкіх Кітаю і СССР"

Бурныя дэманстрацыі і мітынгі пратэсту ў ПАЗШ

Н'Ю-ЁРК, 7. З прычыны патнаццацігодзьдзя з дня ўступленьня ПАЗШ у сусьветную вайну ў Вашынгтоне адбыўся парад, у якім прымала ўдзел 30 тыс. салдат маракоў і членаў патрыятычнай арганізацыі—удзельнікаў сусьветнай вайны.

Адначасова **кампартыяй і рэвалюцыйнымі арганізацыямі ПАЗШ былі арганізаваны ва ўсіх цэнтрах краіны мітынгі пратэсту супроць імпэрыялістычнай вайны.**

У Н'ю-Ёрку на мітынгу прысутнічала **12 тыс. рабочых.** Выступленьні прадстаўнікоў таварыства прыяцеляў Савецкага Саюзу, лігі былых удзельнікаў вайны, прадстаўнікоў кампартыі, камсамолу, рэвалюцыйных маракоў і інш. пралетарскіх арганізацый былі спатканы апладысмэнтамі. Прынята рэзалюцыя, у якой указваецца: «Нашы патрабаваньні—рукі прэч ад Кітаю і Савецкага Саюзу», абвесьцім класавую вайну, імпэрыялістычнай вайне. Затрымлівайце транспарты ваеннага рыштунку для Японіі. Патрабуйце, каб мільярды, прызначаныя для вайны, былі перададзены беспрацоўным. У Дэйтройце 5 тыс. рабочых дэманстравалі ў рабочых кварталах. Потым адбылася дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел 15 тыс. чал. У Чыкага адбылася васьмітысячная дэманстрацыя і 20 мітынгаў ля брам прадпрыемстваў. Па ўсім чыкагскім раёне было арганізавана 67 мітынгаў.

Школьныя будынкі I і II ступені толькі для школьнай работы

МАСКВА. Прэзыдыумам ЦВК СССР прынята пастанова, згодна якой памяшканьні школ I і II ступені павінны быць скарыстаны выключна па простым прызначэньні для школьна-выхаваўчай работы з дзецьмі. Органы Нарасьветы маюць права высяляць у адміністрацыйным парадку ва ўсякія пары году з школьных будынкаў іншыя ўстановы і арганізацыі і асоб, якія ня маюць сувязі са школамі. Пастанова ўводзіцца ў дзеяньне з 1 чэрвеня.

Прэзыдыум ЦВК СССР адхіліў хадайніцтва Штэрна і Васільле ва аб памілаваньні

Хадайніцтва засуджаных па справе аб замаху на дарадцу германскага пасольства п. фон-Твардоўскага Штэрна і Васільлева аб памілаваньні, адхілена прэзыдыумам ЦВК СССР.

Прыгавор аб расстрэле Штэрна і Васільлева прыведзен у выкананьне.

Паўстаньне супроць ангельскага імпэрыялізму ў Іраку

ЛЮНДАН, 8. Агэнцтва «Рэйтэр» паведамляе: «Выступаючы ў палаце абшчын з адказам на запытаньне аб варожых сутычках у Іраку, ангельскі міністар калёніі Кэнфліф Лістар паведаміў, што рух быў выклікан курдзкім шэйхам, які прабаваў абарнуць у новую рэлігію суседнія племяны мэтадамі грабежніцтва і забойства. Пасьля таго, як мірныя мерапрыемствы, праведзеныя, каб пакласьці канец бясчынствам з боку шэйха, аказаліся безрэзультатнымі, іракскі ўрад быў вымушан для аднаўленьня парадку і ўстанаўленьня кантролю над паказанымі племянымі ўжыць ваенную сілу. Тым часам наступіла зіма, і з прычыны суровых кліматычных умоў і гарыстага характару мясцовасьці, ваенныя апэрацыі сталі немагчымымі да вясны».

15 сакавіка буйныя карныя атрады іракскай армії рушыліся ў раён, ахоплены паўстаньнем і ў сучасны момант заняты там аднаўленьнем грамадзянскай адміністрацыі і паліцыі. З ініцыятывы ангельскага вярхоўнага камісара ангельскія паветраныя сілы дапамагаюць іракскім часьцям. Ужо адбылося некалькі сутычак з мяцежнікамі. Ангельскія паветраныя сілы, якія несьлі разьведвальную службу, былі абстраляны, прычым 1 ангельскі лётнік быў забіт, другі паранен. Падзеі адбываюцца ў аддалёным пагранічным раёне іракскага Курдыстану.

У афіцыяльных колах захоўваюць маўчаньне аб становішчы ў Іраку. Аднак, чуткі і адрывачныя паведамленьні з Багдаду і Босры ўказваюць на тое, што іракскі ўрад сур'ёзна заклапочан курдзкім паўстаньнем, на чале якога стаіць шэйх Барзана (пагранічны раён Іраку). Паўстаўшыя курды вядуць партызанскую вайну і спаганяюць у раёнах ахопленых мецяжом падаткі, ігнаруючы іракскі ўрад. Усе намаганьні ўраду затушыць паўстаньне дагэтуль заставаліся безвыніковымі. Пры нападзе паўстанцаў на новыя фарты, пабудаваныя іракскім урадам, адбыліся жорсткія баі паміж урадавымі войскамі і курдамі. Ангельскія самалёты аказваюць энэргічную дапамогу іракскім войскам. Паводле паведамленьня багдадзкага карэспандэнта «Таймс» у Багдад дастаўлена значная колькасьць параненых. Урад амаль нічога не паведамляе аб ходзе кампаніі, баючыся, як відаць, што апублікаваньне сьпісаў страт падбадзёрыла-б паўстанцаў.

Працэс Шэрынгера

БЭРЛІН, 7. У Вярхоўным судзе ў Лейпцыгу пачаўся працэс былога лейтэнанта рэйхсвэра **Шэрынгера, які год назад перайшоў з нацыянал-сацыялістычнай партыі ў кампартыю.** Шэрынгер абвінавачваецца ў здрадзе і ў варожых дзяржаве сувязях.

На судзе Шэрынгер выкрыў ролю нацыянал-сацыялістаў (фашыстаў), як агентаў германскай буржуазіі, гатовых разам з імпэрыялістамі весьці вайну супроць СССР. Шэрынгер заявіў: «Толькі разам з Савецкім Саюзам мыслімма нацыянальнае вызваленьне Германіі. Бальшавіцкая Германія дабіецца свайго вызваленьня; яна створыць народную чырвоную армію таксама, як бальшавікі, якія на 14-ці франтох адбілі свае ворагаў і разьбілі іх у часе грамадзянскай вайны і інтэрвэнцыі. Шэрынгер лічыць, што і генэралітэт рэйхсвэры адносіцца варожа да СССР. Падсудны ўказаў таксама на рост небясьпекі вайны супроць СССР у сувязі з падзеямі на Далёкім Усходзе.

Калі старшыня суда перабіў Шэрынгера, заўважыўшы: «Але-ж аб вайне супроць Савецкага Саюзу чя можа гаварыць ці адзін разумны чалавек, — Шэрынгер адказаў: «Аб гэтым не гаворыць, але аб гэтым думаюць і гэта робіць».

Гаворачы, як ён выйшаў з нацыянал-сацыялістычнай партыі, Шэрынгер заявіў, што пасьля свайго наведаньня штаб нацыянал-сацыялістаў у Мюнхэне і бу нацыянал-сацыялістаў у Гітлерам 1 Гепасьля сваёй гутаркі з Гітлерам 1 Гебальсам, ён прыйшоў да перакананьня, што нацыянал-сацыялісты не зьяўляюцца ні рэвалюцыянэрамі, ні сацыялістамі. Цяпер ён, Шэрынгер, перайшоў у кампартыю і ў гэтым самае цяжкае яго «злачынства», за якое ён цяпер стаіць перад судом.

У Лейпцыгу адбыўся масавы рабочы мітынг пратэсту супроць суда над Шэрынгерам.

НА БУКСІРЫ ПЕРАДАВІКОЎ

АСІПАВІЧЫ. ЛІПЕНСКІ ВУЧАСТАК АСІПАВІЦКАГА ЛЕСПРАМГАСУ КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ЗАГАТОЎЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ ВЫКАНАЎ НА 105,5%, ДРОЎ—НА 89 ПРОЦ.; НА ВЫВАЗЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ — НА 108 ПРОЦ., ДРОЎ—НА 135 ПРОЦ. ПЛЯН ПА ЭКСПАРТНЫХ МАТАР'ЯЛАХ ВЫКАНАН НА 113,5 ПРОЦ. ВЫКАНАЎШЫ З ПОСЬПЕХАМ ЗАДАНЬНЕ, ВУЧАСТАК ВЫЛУЧЫЎ БУКСІРНУЮ БРЫГАДУ З 25 ЛЕСАРУБАЎ І 50 ФУРМАНАК НА ДАПАМОГУ ЛЕЛЬЧЫЦКАМУ ЛЕСПРАМГАСУ, ЯКІ АДСТАЕ.

ШУКЕС.

Ператварыць красавік у месяц штурму па ліквідацыі няпісьменнасьці

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

1. Адзначыць, што праведзены дэкадзік барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, ня гледзячы на некаторы зрух у галіне ахопу, наведваньня, разгортваньня масавай работы і г. д., **не забясьпечыў поўнага ахопу ўсіх няпісьменных**, асабліва рабочых **чыгуначнікаў, МТС, батрацтва і дапрызыўнікаў.** Белкаапсаюз, Белкалгасцэнтр і ЦП саюзу транспартнікаў, МТС і батрацтва **ня ўключыліся** ў правядзеньне дэкадзіка, ня ўжылі належных захадаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці. **Мазырскі, Дрысенскі, Быхаўскі, Пятрыкоўскі, Крупскі** і інш. райкомы КП(б)Б і аддзелы нарасьветы недаацанілі ўсёй палітычнай важнасьці дэкадзіка, фармальна аднесьліся да ягэ правядзеньня, не забясьпечылі ліквідацыю прарыву ў барацьбе за суцэльную пісьменнасьць і гэтым самым паставілі пад пагрозу зрыву выкананьне пастаўленай задачы — ператварэньне раёнаў да 1 мая 1932 г. у суцэльнапісьменныя.

2. У мэтах забясьпячэньня выкананьня пастаўленай пленумам ЦК баявой задачы — ператварэньне БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці— **пераключыць дэкаднік на штурм барацьбы за суцэльную пісьменнасьць тэрмінам на 1 мая,** замацаваўшы цэнтральны і раённыя штабы на гэты тэрмін.

3. Катэгарычна прапанаваць фракцыям цэнтральных арганізацый і ўстаноў, гаркомам і райкомам КП(б)Б мабілізаваць сілы і сродкі на поўную ліквідацыю прарываў па ўсіх вучастках работы. Неадкладна дабіцца ахопу ўсіх няпісьменных, асабліва рабочых і дапрызыўнікаў, замацаваць ахопленых і ўзьняць якасьць навучаньня.

Прапанаваць РК КП(б)Б мабілізаваць партыйныя калектывы, ячэйкі, пазавыя савецкія, камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі на барацьбу за ператварэньне БССР у суцэльна -пісьменную, увязаўшы іх работу па ліквідацыі няпісьменнасьці з правядзеньнем усіх гаспадарча - палітычных мерапрыемстваў і кампаній (выкананьне прамфінпляну, пасеўная кампанія, загатоўкі і інш.).

4. Барацьбу за суцэльную пісьменнасьць ператварыць у штодзенную масавую палітычную работу ўсіх арганізацый і працоўных па сыстэматычным ператварэньні прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў, гарадоў і раёнаў у суцэльна - пісьменныя.

Даручыць НКАсьветы і РК КП(б)Б забясьпечыць арганізаваны перавод усіх ліквідаваўшых сваю няпісьменнасьць у школы малапісьменных.

Даручыць НКАсьветы разам з адпаведнымі арганізацыямі **выявіць і адзначыць лепшых ударнікаў** гэтай работы **грамадзкімі і дзяржаўнымі ўзнагародамі.**

5. Катэгарычна прапанаваць Белкаапсаюзу выканаць папярэднія пастановы ЦК і пад асабістую адказнасьць т. Хаськіна неадкладна забясьпечыць ліквпункты і школы малапісьменных гасьцямі, сшыткамі, алоўкамі.

6. Прапанаваць фракцыі ЦСПСБ і Белкалгасцэнтру ўсклясьці поўную адказнасьць за ліквідацыю няпісьменнасьці сярод рабочых на пазавыя прафсаюзныя арганізацыі і сярод калгасьніка ў на праўленьні калгасаў.

7. Даручыць рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт арганізаваць агляд ходу работы па выкананьні пастаноў ЦК аб ператварэньні БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Выкананьне пляну першага кварталу прамысловасьцю трэсту „Белдрэў"

Паводле даных трэсту «Белдрэў», прадпрыемствы прамысловасьць БССР выканала квартальную праграму на 91,6 проц., у тым ліку па фанэры — 60 проц., па лесапіленьні — 102,4 проц., па ножавай фанэры — на 36,5 проц., па стандартных дамох — на 79,7 проц., па гнутай мэблі — на 82,8 проц., па сталярнай мэблі — на 128,3 проц., па буддэталях — на 104,3 проц. Паасобныя заводы далі наступныя паказальнікі: Бабруйскі камбінат — 88,3 проц., завод імя Фрунзэ — 103,6 проц., завод імя Варо́ўскага — 99,4 проц., «Спартак»— 83 проц., імя Халтурына — 164,7 проц., Віцебскі — 93,2 проц., «Калектыўная праца» — 128 проц.. «Сацыялізм» — 94,7 проц., імя Томскага — 88 проц., «Адрадзжэнец» — 90,3 проц., «Камінтэрн» — 102,6 проц., завод імя Молатава (Менск) — 93,4 проц.., «Пралетары» — 60,8 проц., Полацкі дрэвазапрацоўчы завод — 33,1 проц.

Мэталявырабы

За 2 красавіка завод «Інтэрнацыянал» выпрацаваў 980,2 клгр. вінтоў, або 106,6 проц. пляну, 3-га красавіка выпушчана — 962,3 кгр. вінтоў, або 104,7 проц. пляну.

На 1 БелДРЭС

За 4 красавіка 1 Белдрэс выпрацавала 176.500 клв. гадз., максымум дасягнуў 9.500, мінімум—6.400 клв., у сярэднім — 7.300 клв.

Работа гутаў у першым квартале

Заводы Белшклоаб'яднаньня за 1 квартал 1932 году выпусьцілі прадукцыі на суму 2.397 тысяч руб., або 105,2 проц. заданьня. Завод «Камінтэрн» выпусьціў прадукцыі на суму 469.100 руб., або 122,6 проц., завод «Каспрычнік» даў прадукцыі на 576.400 руб., або 87,6 проц., завод Дембаля — на 808.800 руб., або 110,1 проц. пляну; завод «Ільліч» — на суму 261.800 руб., або 91,9 проц.; завод «Пралетары» выпусьціў прадукцыі на суму 281.300 руб., або 92,1 проц. квартальнага пляну.

Будматар'ялы

За 5 красавіка дрэвазапрацоўчы **камбінат «Камінтэрн»** расьпілаваў 158,9 кбм. сырцу, або 89,4 проц.; фанэры выпушчана 49,3 кбм., або 108,11 проц.

За 7 красавіка камбінат расьпілаваў 209,4 кбм. сырцу, або 94,9 проц. і фанэры выпушчана 51,9 кбм., або 105,2 проц.

Угнаеньні

Крычаўскі фасфарытны завод за пяцідзенку з 1 па 5 красавіка выпусьціў 77 тон фасфарытнай мукі, або 48,1 проц. заданьня.

Скура

З 1 па 5 красавіка гарбарня **«Бальшавік»** выпусьціла прадукцыі на 180.225 руб., што складае 106 проц. пляну. У тым ліку 1 хромавы цэх даў прадукцыі на 94.520 руб. — 113,8 проц. 2-гі хромавы цэх выпусьціў прадукцыі на суму 71.257 руб., або 100,4 проц. заданьня.

***

Рымарна - сядзельная фабрыка (Магілеў) за 1 пяцідзеньку красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 93.883 руб. — або 70 проц. заданьня.

Швэйныя вырабы

З 1 па 5 красавіка **швэйная фабрыка** «Кастрычнік» выпусьціла 12.984 паліто, што дае 100,7 проц. пляну.

Фабрыка «Прафінтэрн» (Віцебск) за пяцідзеньку з 1 па 5 красавіка выпусьціла 2.790 жаночых польтаў, або 93 проц. пляну.; 3.050 гумовых польтаў, або 72,8 проц.

Усяго выпушчана 39.060 польтаў, або 91,1 проц. пляну.

Папера

За 5 красавіка папяровая фабрыка «Спартак» выпусьціла — 9 тон 493 кгр. паперы, што складае 48,13 проц. пляну.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка за 5 красавіка выпусьціла 3.217 пар абутку, або 102,13 проц. пляну, у тым ліку ботаў 1.310 пар — 128,4 проц. заданьня, мужчынскіх бацінак — 401 пара — 38,9 проц.

***

Менскай абутковай фабрыкай выпушчана за пяцідзеньку з 1 па 6 красавіка — 22.293 пары абутку, або 110,6 проц. праграмы.

За 7 красавіка выпушчана 4.457 пар абутку — 110,6 проц. заданьня.

Збор мэталялому

За пяцідзеньку з 1 па 5 красавіка менскай міжраённай базай мэталялому сабрана 38.477 кгр. чорнага лому, што складае 44,7 проц. пляну. Каляровага лому сабрана 914 кгр., або 18,5 проц.

Паводка ў БССР

З 7 красавіка вада ў рэчцы Сьвіслач пачала спадаць. Выпэйны ўздым вады дасягнуў 2,20 мэтра звыш ардынару. 8 красавіка вада ўпала да 1,39 мэтра. 9 красавіка да 4 гадз. дня яна падняласа да 1,52 мэтра, што выклікана ўскрыцьцём прытокаў Сьвіслачы. У часе паводкі па Менску вадою былі заліты вуліцы: Садовая, Садова-Бярэзінская, частка гарбарнай, Пуліхоўская слабада, Шлёбанскі завулак, частка Пралетарскай вуліцы, Серабранка, М.-Татарская. Ст.-Слабодзкая, Ст.-Віленская, частка Кастрычніцкай і інш. З залітых дамоў была пераселана 200 сем'яў. У часе паводкі ў Менску асабліва добра працавалі міліцыя і пажарная каманда.

Дзякуючы своячасова прынятым мерам, барацьба з паводкай прайшла арганізавана і ня прынесла амаль ніякіх страт. Электрастанцыя, заводы і фабрыкі працавалі бесперапынна.

Зараз наглядаецца значны ўздым вады ў рэках: Заходняя Дзьвіна, Сож, Дняпро, Бярэзіна. Паміж 9 і 10 красавіка чакаецца яшчэ большы ўздым. У кожным раёне арганізаваны тройкі па барацьбе з паводкай, якія прыцягнулі да свайй работы таварыствы ратаваньня на водах.

Праведзен агляд фабрык і заводаў, складаў, устаноў, якія знаходзяцца ў месцах, дзе пагражае паводка. Праведзен таксама агляд мастоў, дамбаў, платна чыгункі і інш. месц, якія могуць быць пашкоджаны ў часе разводзьдзя (БЕЛТА).

Папраўкі

У зьмешчанай у нумары за 8 красавіка пастанове аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б «Аб культурным будаўніцтве БССР» па тэхнічным недаглядзе пры наборы дапушчаны паасобныя прыкрыя памылкі:

У першай калёнцы 10-ты абзац трэба чытаць:

«Шпарка расьце кніжная прадукцыя. У 1931 годзе на беларускай мове выдана звыш **10 млн.** кніг супроць 1.400 тысяч у 1924 годзе...».

У чацьвертай калёнцы першага абзацу апошнія словы, узятыя ў коскі, трэба чытаць:

«(Памяшканьне, сталоўкі, інтэрнат, **падручнікі** і г. д.)».

У разьдзеле III «У галіне работы сярод інтэлігенцыі» апошні абзац другой калёнкі і пачатку трэцяй трэба чытаць:

«Пленум адзначае нездавальняючае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб матар'яльным забясьпячэньні тэхнічных і навуковых кадраў і катэгарычна прапануе ўсім партарганізацыям неадкладна праверыць, як праводзіцца забясьпячэньне, прыцягваючы да суровай адказнасьці вінаватых у **невыжаньні** дырэктыў партыі і ўраду па гэтым пытаньні».

Пункт «б» трэцяй калёнкі гэтага-ж разьдзелу трэба чытаць:

«Забясьпечыць будаўніцтва ў 1932-33 годзе чатырох **жыльлёвых** памяшканьняў для навуковых і тэхнічных кадраў, згодна пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР».

У разьдзеле 7-м «У галіне разьвіцьця мастацтва» апошні абзац трэба чытаць:

«Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК указвае, што далейшае дасьпяховае разьвіцьцё беларускай культуры, мастацтва, літаратуры патрабуе шырокага выкарыстаньня і крытычнай перапрацоўкі будуючайся беларускай сацыялістычнай **культурай** усіх каштоўнасьцяй сусьветнай культуры...».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

11 красавіка г.г. у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Камасьветы (рог вул. Карла Маркса і Энгельса) склікаецца

ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ

ПАРАДАК ДНЯ:

Вынікі выкананьня прамфінпляну за першы квартал

(даклады Мэталяаб'яднаньня, Скураб'яднаньня, Швэйаб'яднаньня і Наркамснабу).

На сход партактыву запрашаюцца: трыкутнікі прадпрыемстваў і гаспадарчых устаноў і арганізацый, фракцыі ЦП прафсаюзаў, сакратары цэхячэек, групоргі і парторгі, загадчыкі цэхаў і майстры (камуністы).

Сакратаром калектываў і яч. КП(б)Б належыць атрымаць білеты на сход партактыву ў гаркоме КП(б)Б (пакой № 10) 10 і 11 красавіка з 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня.

Члены ЦК і ЦКК, гаркому і гар. КК КП(б) праходзяць на сход партактыву па сваіх мандатах.

Менгарком КП(б)Б.

Менгарсавет Асоавіяхіму даводзіць да ведама ўсіх сакратароў яч. Асоавіяхіму, што 12 красавіка у 6 г. веч., у памяшк. Белдзяржтэатру адкрываецца

ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ АСОАВІЯХІМУ.

Выдача мандатаў пачынаецца 10-IV з 11 гадзін раніцы да 10 гадз. веч., у памяшканьні Менгарсавету Асоавіяхіму (Пляц Волі, 4).

За атрыманьнем мандатаў зьявіцца сакратаром ячэек Асоавіяхіму і дэлегатам.

МЕНГАРСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ.

Габінэт друку газэтнага аддзяленьня Камвузу імя Леніна.

АРГАНІЗУЕ

ДАКЛАД БРЫГАДЫ „ЗЬВЯЗДЫ", якая праводзіла работу ў Батвінскім сельсавеце, Крычаўскага раёну, на тэму:

„ЗЬВЯЗДА" на перадавых пазыцыях барацьбы за трэцюю бальшавіцкую вясну—дакл. тав. ДЖЭЛЮК.

Даклад адбудзецца 11 красавіка, у 7 з пал. гадз. веч., у пакоі № 53 (2-гі паверх). Запрашаюцца студэнты КУБ, работнікі рэдакцый цэнтральных газэт, шматтыражак і штодзенак г. Менску.

Габінэт друку КУБ.

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі

СЭКТАР КНІГАНДЛЮ.

ВЫШЛА З ДРУКУ

Даўгаполаў Х. Л.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ АНТЫВЫЛІКОДНАЙ КАМПАНІІ 1932 ГОДУ.

Тыр. 15000, ст. 32, ц. 20 кап.

ПРОДАЖ УТВАРАЕЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ ДВЕ, СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ І САЮЗДРУКУ.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА"

Працягваецца прыём падпіскі на 1932 год

НА ЧАСОПІСЬ ПАЛІТЫКІ І ПРАКТЫКІ ПАРТЫЙНАЙ ПРАЦЫ

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

ОРГАН ЦК КП(б)Б.

Кожнаму партыйцу, актывісту, прапагандысту неабходна чытаць „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ".

Часопісь „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" ў 1932 годзе выходзіць два разы ў месяц (24 №№ у год).

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 1 м.— — 40 к. | на 6 м.—2 р. 40 к.
на 3 м.—1 р. 20 к. | на 12 м.—4 р. 80 к.

ПАДПІСКА ПРЫМЛЕЦЦА: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі на друку ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня.

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".

ПРАЛЕТАРЫ.

„СПАРТАК"

Замежны мастацкі фільм Я ВОЛЬНЫ (ВІНАВАТЫ)

ДУГЛАС ФЭРБЭНКС у амэрыканскім фільме СЫН ЗОРО.

М. А. Чэхаў і В. С. Малінаўская ў мастацкім фільме ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ

Мастацкі фільм РАЗГРОМ драма ў 7 частках.

Біяляґічны інстытут БАН — СКЛІКАЕ — на 11 красавіка, у 10 гадз. раніцы, у памяшканьні БАН (Ленінская, рог Унівэрсытэцкай, 35-28, 2-гі паверх, зала пасяджэньняў)

ґельмінталеґічную нараду

на якой будуць абмяркоўвацца наступныя пытаньні: 1) Інфармацыі аб правяденай ґельмінталеґічнай працы па БССР у 1932 г. (БАН, Віцебскі дасьледчы інстытут). 2) Ґельмінталеґічная экспэдыцыя 1931 г. і плян намечаных экспэдыцый на 1932 г. (БАН, Віцебскі дасьледчы інстытут). 3) Асноўныя пытаньні ґельмінталеґічных прац па БССР на другую цыцігодку (БАН, Віцебскі дасьледчы інстытут). 4) Бягучыя пытаньні. Запрашаюцца вэт. і мэд. працаўнікі і зацікаўленыя ўстановы.

Дырэкцыя інстытуту.

ІНСТЫТУТ філёзофіі БАН.

10 красавіка г. г., у 6 гадз. веч., у памяшк. ін-ту філёзофіі БАН (пав. 10, 2-гі паверх) адбудзецца даклад т. Розенгауза на тэму: „Сацыял-фашызм і рэлігія".

Запрашаюцца антырэлігійнікі і ўсе жадаючыя.

Дырэкцыя ін-ту.

Дзяржаўнае Выдавецтва БЕЛАРУСІ

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

Вышаў з друку ВУЧЭБНЫ ПЛЯН Вышаў з друку

ДАПАМОЖНІК ПА ВАЙСКОВЫМ НАВУЧАНЬНІ (Зладжыў Белаліецкі).

ЦАНА КАМПЛЕКТУ (4 КАРТЫ) 75 кап.

Продаж утварэецца ва ўсіх кнігарнях ДВБ спажыўкаапэрацыі саюздруку.

ПАТРЭБНЫ для працы ў сыстэме Белсьвіноводтрэсту тэхнік-будаўнік, з дзесятнікі-будаўнікі.

Аплата па згодзе.

Менск, (Савецкая, 70), Белсьвіноводтрэст.

МЕНСКІ ЯУРЭЙСКІ С.-Г. ТЭХНІКУМ

(у курасоўшчыне)

які рыхтуе агранома сярэдняй кваліфікацыі для прыгарадных саўгасаў БССР.

АБВЯШЧАЕ ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ

на гародніце і малочна-жывёлагадоўчае аддзяленьні.

Пачатак заняткаў 3-га мая.

Таксама працягваецца прыём заяў на 5-мясячныя курсы па падрыхтоўцы да весьнавога набору